Беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыднёва

НАША НІВА

№ 28 (66)
14 кастрычніка
1996 г.

выходзіць у панядзелкі

Архівы КГБ

10 гадоў бяз права перапіскі...

Пра масавыя рэпрэсіі 30-50-х гадоў напісана нямала. Часам нават можа падацца, што ўсё ўжо зразумела, усё вядома. Але гэта далёка ня так... З-за практычна поўнай закрытасьці архіваў дзяржбясьпекі мы амаль нічога ня ведаем пра фальсыфікацыі ў дзяржаўным маштабе сапраўдных прычынаў і датаў сьмерці нашых грамадзянаў, бязьлітасна зьнішчаных у тыя крывавыя гады...

Пра лёсы арыштаваных хлусілі заўсёды. Гэта ведае кожны, хто прайшоў чэргі ля даведачных акенцаў — пракуратуры, міліцыі, ГУЛАГу. Твой блізкі сядзеў у адной турме, а табе называлі іншую; яго везьлі на Ўсход, а казалі, што на Поўнач, альбо ўвогуле казалі: «сьведчаньняў пра месца знаходжаньня ня маем»; хлусілі пра прычыны арышту і прысуду, хлусілі пра стан здароўя. І асаблівая няпраўда — пра прычыны сьмерці: «сардэчная нястача», «запаленьне лёгкіх», але ніколі ня голад, не сухоты, не самагубства, не расстрэл.

Праўда раскрывалася памалу, пачынаючы зь сярэдзіны 1950-х. Аднак была катэгорыя ахвяраў рэпрэсіяў, пра лёс якіх працягвалі сьвядома хлусіць і ў пару першай рэабілітацыі, і пры «застоі», і ў разгар перабудовы. Пад забаронай ва ўсе гэтыя эпохі заставалася праўда пра лёсы тых, хто быў растраляны паводле прысудаў несудовых органаў — «асобых троек», «двоек», Асобай нарады і г.д.



Першы зь вядомых нам загадаў НКВД наконт гэтага пытаньня датаваны 1939-м годам. Загад прадпісваў на запыты сваякоў пра лёс таго альбо іншага расстралянага адказваць, што ён быў асуджаны на 10 гадоў ІТЛ (папраўча-працоўны лягер) бяз права перапіскі і перадачаў. Увосені 1945 году загад быў скарэктаваны — заяўляльнікам сталі казаць, што іхнія сваякі памерлі ў месцах пазбаўленьня волі.

Ішлі гады, пытаньні вакол лёсаў расстраляных назапашваліся і прымушалі і МГБ, і Міністэрства юстыцыі, і Пракуратуру зьвяртацца ў «інстанцыі» (г.зн. ЦК КПСС) з просьбай вынесьці рашэньне па ўсіх аспэктах праблемы: што адказваць вусна, якія адказы можна даваць пісьмова, як і дзе рэгістраваць сьмерць, якія дату, прычыну і месца ўносіць у пасьведчаньні аб сьмерці, ці выдаваць якія-небудзь дакумэнты, зьвязаныя з маёмаснымі праблемамі і г.д.

На паседжаньні Прэзыдыюму ЦК КПСС 18 жніўня 1955 году, дзе разглядалася гэтае пытаньне, была вынесеная пастанова, на аснове якой праз тыдзень тагачасны старшыня КГБ СССР І.Сяроў выдаў разгорнутае ўказаньне. Прадпісвалася і надалей паведамляць пра расстраляных, што яны былі прысуджаныя да 10 гадоў ІТЛ і памерлі падчас адбыцьця пакараньня.

У асаблівых выпадках (калі гэта патрабавалася для рашэньня маёмасных альбо прававых пытаньняў) прадпісвалася рэгістраваць сьмерць у органах ЗАГС на месцы жыхарства асуджанага да арышту і выдаваць пасьведчаньне аб сьмерці. Пры гэтым дата

Працяг на старонцы 13.

Прысутнасьць

Франкфурцкі кніжны кірмаш

Убеларускай прысутнасьці на Франкфурцкім кніжным кірмашы не было анічога нечаканага: дзяржаўныя выдавецтвы на чале зь Бельскім выехалі дэманстраваць дасягненьні, недзяржаўныя паехалі працаваць — выкупляць правы на выданьні, шукаць новыя кніжкі й кніжныя сэрыі.

Уражаньні Ігара Бабкова — на старонцы 4.

Палітычны камэнтар

Час нараджэньня джыгітаў

Падобна, што працяглае дуэльнае паміж прэзыдэнтам і парлямэнтам пасьля падзеяў 10 і 11 кастрычніка ў Вярхоўным Савеце набывае якасна іншую форму. Дата рэфэрэндуму канчаткова разьвяла супраціўнікаў па розныя бакі накуль яшчэ ўяўных барыкадаў. Апошняя спроба А.Лукашэнкі з дапамогай сваёй фракцыі ў ВС пераламіць сытуацыю на сваю карысьць пацярпела няўдачу.

Выканаўчай уладзе, як паветра, быў патрэбны легітымны рэфэрэндум, прызначаны менавіта на 7 лістапада. Але два дні, праведзеныя Лукашэнкам у парлямэнце з мэтаю здабыцьця легітымнасьці, скончыліся нічым. Уся падрыхтоўчая праца, праведзеная праваднікамі прэзыдэнцкай лініі на чале з Ул.Канаплёвым і Ю.Малумавым, дала нулявы вынік. Са ста дзесяці дэпутатаў - падпісантаў вядомага звароту ў падтрымку прэзыдэнцкага рэфэрэндуму пасьля таемнага галасаваньня праз кабіны засталося толькі 84.

Але вынік галасаваньня ня стаў нечаканасьцю, бо адбываўся менавіта праз кабіны. Асноўная барацьба разгарнулася перад гэтым — за спосаб галасаваньня. Цікава было назіраць, як Ул.Канаплёў, кіраўнік фракцыі Лукашэнкі, ледзяным голасам заганяў на месца нейкага народнага выбранньніка, які спрабаваў зьнікнуць у адказны момант з залы паседжаньняў. Цяпер, калі прыхільнікі кіраўніцтва ВС могуць кампэнсаваць колькасьць страчаных нэрвовых клетак адносна перамогай, то камандзе Лукашэнкі значна дабавілася праблемаў. Гэта было відаць з паводзінаў самога Лукашэнкі і яго паплечнікаў.

Спрабуючы трымацца ў рамках, прэзыдэнт урэшце сарваўся, не аднойчы ўскокваў са свайго месца і ўступаў у спрэчкі з выступоўцамі. Наскокі прэзыдэнта ў адказ на выступ дэпутата А.Клімава сьведчылі пра страту Лукашэнкам раўнавагі і нават пра пэўны адчай.

Дарэчы, некалькі словаў пра старшыню Канстытуцыйнага Суда. Чым адрозьніваецца сапраўдны мужчына-джыгіт ад проста мужчыны? У крытычныя моманты мужчына-джыгіт выяўляе стойкасьць духу. Канстытуцыйны Суд на чале з В.Ціхінем некалькі разоў фактычна ратаваў дэмакратыю ў краіне, прымаючы адэкватныя рашэньні пры парушэньнях Канстытуцыі з боку выканаўчае ўлады. Ясна, што пазыцыя старшыні ў гэтых умовах была вырашальнай. Можна толькі здагадвацца, які ціск ён здолеў вытрымаць, усьведамляючы сваю ролю і адказнасьць у гэтыя моманты. Таму яго, нягледзячы на сталы ўзрост і нягучнае прозьвішча, можна сьмела заносіць у катэгорыю джыгітаў. Побач, напрыклад, са сп. Хадыкам і Сіўчыкам. І ў гэты раз паводзіны старшыні былі годныя, адпавядалі высокай пасадзе.

Пабачыўшы, што ягоны сцэнар сарваны, разззлаваны прэзыдэнт пакінуў парлямэнт, заявіўшы, што больш кампрамісу зь Вярхоўным Саветам ён шукаць ня будзе. Маўляў, у яго застаецца адзін варыянт — наўпрост зьвярнуцца да народа на ўсебеларускім сходзе, які ён цяпер і рыхтуе.

Пасьля абвешчаньня выніквў таемнага галасаваньня нэрвова заявіў пра сваю адстаўку з пасады намесьніка старшыні ВС Ю.Малумаў.

Парлямэнт праваліў ініцыятыву Лукашэнкі цалкам у стылі беларускага сялянства. Шмат хто з дэпутатаў, што былі вымушаныя падпісаць вядомы зварот, бо ня мелі сьмеласьці адкрыта выказаць сваю пазыцыю ў адказ на прымус і наезды, пайшоў у кабіны для галасаваньня з фігай у кішэні. Гэта быў своеасаблівы «наш адказ Чэмбэрлену». А Лукашэнка забыў, што на беларускага селяніна наяжджаць ужо нельга.

У часе галасаваньня стала вядома, што ўлады забаранілі мітынг «У абарону Канстытуцыі», прызначаны на 19 кастрычніка.

Што можа адбыцца далей?

Заява сп. Малумава сьведчыць, што выканаўчая ўлада канчаткова рве дачыненьні зь Вярхоўным Саветам і выводзіць з-пад удараў сваіх прыхільнікаў. Цяпер на ВС будуць вешаць усіх сабак. Адначасова Вярхоўны Савет мусіць пазбавіцца кворуму. Але каб канчаткова паралізаваць дзейнасьць парлямэнту і паказаць, хто ў доме гаспадар, Лукашэнку непазьбежна давядзецца ўводзіць у гульню сілавыя ведамствы.

Выступаючы ў зале паседжаньняў, прэзыдэнт неаднойчы заяўляў, што не зьбіраецца прымяняць сілу ў супрацьстаяньні з парлямэнтам, але чым больш пра гэта гаварылася, тым менш у гэта верылася.

Зьбіраньне ў Менску на 19 кастрычніка вялікай колькасьці вайсковай сілы — факт красамоўны. А выкарыстаньне такой сілы — гэта ўжо зусім іншая ступень узаемаадносінаў і мера адказнасьці. Ведаючы пра імкненьне Лукашэнкі да неабмежаванае ўлады, ня надта верыцца, што ён утрымаецца. Шахматная гульня з парлямэнтам скончылася не на ягоную карысьць, таму далей адносіны мусяць высьвятляцца на рынгу. Гэта значыць, што набліжаецца час нараджэньня джыгітаў — сапраўдных мужчынаў, для якіх галоўным крытэрыем будзе сумленьне, годнасьць і стойкасьць.

Алег Дашкевіч

Расея — зблізку

Аўтамабіль — расейскае вар'яцтва

Кольскасьць аўтамабіляў у Расеі ў пераліку на тысячу жыхароў складае пакуль меней за 10 працэнтаў амэрыканскага ўзроўню. Гэтым тлумачыцца павышаны інтарэс, які выказваюць за акіянам да аўтамабільнага рынку 150-мільёнай краіны. Праблеме расейскага аўтамабілебудаваньня прысьвечана сэрыя артыкулаў Джэры Флінта і Пола Хлебнікава ў амэрыканскім бізнэсовым часопісе «Форбс».

Расейцы, як у свой час амэрыканцы, звар'яцелі на аўтамабілях, — пішуць аўтары. — У газэтным шапіку мы налічылі 11 часопісаў, якія прысьвечаны аўтамабілю, і ўсяго 5-6 — сэксу. З сэксам як быццам няма асаблівых праблемаў, а вось аўтамабілі ўсё яшчэ застаюцца прадметам мары. Напрыклад, на вуліцах Масквы вельмі шмат машын: ня толькі «Лады», «Жыгулі», «Волгі» і «Масквічы», але і «Мэрсэдэсы», «БМВ», «Вольва», «Блэйзэры», «Саабы», «Шэўрале» і джыпы «Крайсьлер». Міліцыя езьдзіць у вялікіх «Фордах».

Дык чаму ж аўтамабільная прамысловасьць Расеі такая занядбаная?

Вытворчасьць легкавых машын, аўтобусаў і грузавікоў на 11 расейскіх заводах скарацілася ў параўнаньні з максымальным узроўнем прыкладна на 50 працэнтаў і склала 1 мільён, пры гэтым на мяжы закрыцьця знаходзяцца два вялікія прадпрыемствы.

Працяг на старонцы 16.

Навінка!

Менская вясна — 1996

Сёлетняя сьцюдзёная Менская Вясна — гэта сэрыя масавых акцыяў пратэсту супраць аўтарытарнага рэжыму прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнкі ў Беларусі. Мітынгі, пікеты, зьбіцьцё дэманстрантаў, арышты, галадоўкі, палітычныя суды, пагромы, вобыскі, — усім гэтым на працягу трох веснавых месяцаў было напоўненае грамадзкае і палітычнае жыцьцё краіны. Усё гэта стала галоўнай тэмай матэрыялаў незалежнае прэсы, дакумэнтаў і ўспамінаў, якія склалі новую кнігу «Менская вясна — 1996».



Кніга падрыхтаваная ў выдавецтве «Наша Ніва» ў Менску і надрукаваная з дапамогай Цэнтра культуры «Кола Падковы» ў прадмесьці Варшавы — Падкове Лесьной.

«Кола Падковы» разумее сябе як поліжанравы асяродак культуры. Апрача чыста культурніцкіх імпрэзаў у Падкове адбывалася спатканьне «Палякі і ўкраінцы ў 1918-48 гады: цяжкія пытаньні». Зацікаўленасьць гісторыяй нашага рэгіёну ў XX ст. прымусіла асяродак «Кола Падковы» спрычыніцца да выданьня кнігі пра сучасныя падзеі ў Беларусі.

«Менская вясна — 1996» — гэта першы плён рэалізацыі новага беларускага незалежнага праекту — Архіву Найноўшае Гісторыі. У плянах Архіву на 1997 г. выданьне «Слоўніка беларускай апазыцыі 1953-1991» і «Каталёгу беларускіх непадцэнзурных выданьняў 1953-1991».

Н.Н.

Парушаны балянс

Пры ўсёй дыскусійнасьці вызначэньня грамадзтва пэўнай застаецца ерархічная структура той узаемазалежнасьці людзей, якая і ўтварае грамадзтва. Усё грамадзтва працінаюць структурныя сувязі, ерархічная арганізацыя якіх зьяўляецца гарантам жывучасьці грамадзкае сыстэмы. Са зьяўленьнем у XX ст. агульнай тэорыі сыстэм і кібэрнэтыкі паняцьце «ерархія» набыло агульнанавуковае значэньне й стала выкарыстоўвацца пры апісаньні любых сыстэмных аб'ектаў. Ерархія абвяшчаецца вечным атрыбутам жыцьця як такога.

У індустрыйных грамадзтвах дзяржаўная арганізацыя гэтае ерархіі зьяўляецца самай спрошчанай і неразьвітай формай структураваньня. Такой была савецкая сыстэма, якая мела сваю ерархію, сфармаваную партыйнай структурай і афіцыйнай ідэалёгіяй. Намаганьні падпарадкаваць усё грамадзтва карпаратыўным інтарэсам прывялі савецкі рэжым да краху.

Што робіць Лукашэнка? Афіцыйны характар папулісцкіх лёзунгаў рэальна фіксуе парушэньне балянсу ў грамадзтве: старыя грамадзкія аўтарытэты ўжо мала чаго значаць, усе новыя зьявы жыцьця жорстка кантралююцца і калі развіваюцца, то ў вельмі нскамфортных умовах. Кепска ўсім — і старым, і маладым. Парушэньне ерархіі праяўляецца і ва ўсязнайстве, у тым унівэрсалізме, які накідаецца грамадзтву.

Для жыцьця ў сучасным грамадзтве патрэбная спэцыялізацыя. Тут асобны чалавек ня можа кампэтэнтна арыентавацца ва ўсіх праявах сацыяльнага жыцьця. Традыцыйны сялянскі тып (асобна зазначым — ранейшы) — гэта тып унівэрсальны, ва ўсіх вясковых справах, ад аграрных да культавых, селянін мусіць арыентавацца сам. Трапляючы ў горад, не прайшоўшы адпаведнай урбаністычнай культурацыі, сацыялізацыі, унівэрсальны селянін ператвараецца ва ўсязнайку — ён усё ведае сам, яму не патрэбныя парады спэцыялістаў, для яго ня важныя аўтарытэты прафэсіяналаў. А тут у якасьці кіраўніка дзяржавы зьяўляецца такі ўнівэрсал. Уся складанасьць сацыяльнага жыцьця нічога ня значыць перад простымі жаданьнямі ды вераю ва ўсемагутнасьць дзяржаўнага інструмэнтарыя. Постсакамуністычную сытуацыю, калі грамадзтва не нарадзілася ва ўсёй паўнаце, францускі палітоляг Гі Эрмэ проста сьпісвае зь сёньняшняе Беларусі: «Эканамічны маразм і адміністратыўны гармідар, якія замянілі адносную камуністычную дысцыпліну, толькі паскорылі ўцёкі ў абвостраны індывідуалізм, замест таго, каб прытармазіць іх». Гэтыя індывідуалісты-ўсязнайкі складаюць базу цяперашняга рэжыму, які вядзе да вычэрпваньня каштоўнасьцяў і абвастрэньня апатыі.

Сёньня, як некалі раней, грамадзтва імкнуцца падпарадкаваць інтарэсам карпарацыі ўлады, прычым гэтыя інтарэсы выдаюцца за інтарэсы дзяржавы. Грамадзкую ерархію спрабуюць замяніць толькі дзяржаўнай арганізацыяй жыцьця. Зьнішчаючы канкурэнтаў (палітычную апазыцыю ці парлямэнт), разгойдваючы грамадзкую ерархію, карпарацыя расчышчае месца для рэалізацыі сваіх плянаў. Дэмакратыя ператвараецца ў разьняволенасьць некампэтэнтных ацэнак. Вось чаму лёзунгі пра рэфэрэндумы, пра патрэбу «параіцца з народам» выглядаюць вельмі арганічна ў сыстэме сёньняшняе ўлады, бо ёй выгадная некампэтэнтнасьць. У выніку, праблема нармалізацыі грамадзкага жыцьця фармулюецца для Беларусі як праблема ўсталяваньня балянсу ў грамадзтве —мусяць паўстаць ерархічныя сувязі, спэцыялізаваныя й аўтарытэтныя сацыяльныя групы.

Праблемы сучасных індывідуалістычных заходніх грамадзтваў нарадзілі тэзу пра тое, што дэмакратыя павінна знайсьці выратаваньне ў зьмяншэньні сваіх дамаганьняў. Гэткае адбудзецца праз прызнаньне кампэтэнтнасьці, якой неабавязкова можа валодаць большасьць. Беларускаму ж грамадзтву патрэбная свая ўнутраная ерархія, якая абмяжуе паніжэньне парогу дэмакратычных патрабаваньняў з-за панаваньня некампэтэнтных адзіночак, аб'яднаных у карпарацыю ўлады.

Алег Дзярновіч

"Наша Ніва" незалежны тыднёвік НАША НІВА
заснаваны ў 1906, адноўлены ў 1991
заснавальнік і выдавец Павал Жук
рэдактар Сяргей Дубавец
адказны сакратар Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі
навіны Уладзімер Бараніч
рэдактар дадатку "Інфарматар" Андрэй Лапцёнак
макет Віктар Корзун
дызайн і вёрстка Лявон Раманчык
набор Тацяна Чуйвід
стыль і карэктура Паўлюк Канавальчык
пры ўдзеле Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі Зьміцер Бартосік (тэл. 56-94-36)

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 239-78-49
E-mail: edit@niva.minsk.by

Падпісны індэкс 63125

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.

П а э т у т у р м е К Г Б

Адамовічу горш...

11 кастрычніка ў Вярхоўным Судзе адбылося паседжаньне Судовай калегіі па крымінальных справах, на якім разглядалася справа Славаміра Адамовіча і газэты «Выбар». Нягледзячы на прысутнасьць у залі маці паэта, нягледзячы на аргумэнтаваныя довады адваката, сп. Паганяйлы, нягледзячы на абсурд абвінавачаньня, калегія вынесла найбольш жорсткую з магчымых пастанову.

Справа ў Вярхоўным Судзе разглядалася ў касацыйным парадку, які дзейнічае для перагляду прысудаў і рашэньняў, што не набылі законнай сілы.

У адказ на пратэст Віцебскага суда, у якім было ўказана на грубыя парушэньні сьледзтвам крымінальна-працэсуальнага кодэксу і надуманасьць абвінавачаньняў, якія не былі давездзены сьледчым, судовая калегія Вярхоўнага Суда пасьля вельмі доўгага абмеркаваньня пры зачыненых дзьвярах вынесла пастанову: пратэст Віцебскага суда падлягае адмене, а справа – накіраваньню ў гэты ж суд для разгляду... ў іншым складзе судзьдзяў. У пэўным сэнсе, лягічны ланцуг тут прасочваецца ясна: можна памяняць усё, што не адпавядае ўяўленьням рэжыму пра Беларусь, пра Мову, пра Канстытуцыю, пра Мараль і Права... Калі судзьдзі ня «іхныя» — памяняюць судзьдзяў. Адвакат Адамовіча, спадар Паганяйла сёньня ўжо перакананы, што гэтая справа — чыста палітычная і вядзецца па пэўнай замове.

Адвакат прадставіў суду экспэртныя заключэньні вядомых беларускіх літаратуразнаўцаў: А.Рагулі, М.Тычыны, А.Лойкі, Я.Янушкевіча, П.Васючэнкі. Толькі ўжо адзін пералік імёнаў спэцыялістаў, якія катэгарычна абвяргаюць абвінавачаньне, мусіў бы зьбянтэжыць далёкіх ад праблемаў літаратуры юрыстаў. Але дзе там!.. Адступаць не было загаду. Нягледзячы на палымянае красамоўства адваката, які пераканаў усіх прысутных у зале, судовая калегія была няўмольная. Нават паведамленьне пра тое, што стан здароўя Адамовіча ўвесь час пагаршаецца, не схіліла судзьдзяў да замены турэмнага зьняволеньня да суда на іншую форму стрыманьня.

Пазьней маці Славаміра паведаміла, што цяпер ёй забаранілі перадаваць сыну нават лекі...

Указаньні суда касацыйнай інстанцыі абавязковыя для Віцебска. Касацыйнае вызначэньне абскарджаньню не падлягае і набывае сілу закона з моманту вынясеньня... А што, калі ў Віцебску апынецца сумленных судзьдзяў больш, чым разьлічваюць тыя, хто дырыгуе ў гэтым фарсе?

Такім чынам, справа Адамовіча зацягваецца і кропкі ў гэтай гісторыі мы расставім, бадай, няхутка. Хоць пэўныя высновы можам зрабіць ужо цяпер.

Іна Паскаль

Явар і каліна

Міжнародныя Купалаўскія чытаньні

7-8 кастрычніка ў музэі Янкі Купалы ў Менску праходзілі Міжнародныя Купалаўскія чытаньні, прысьвечаныя 90-м угодкам з дня заснаваньня легендарнай беларускай газэты «Наша Ніва».

Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы

На канфэрэнцыю зьехалася шмат дасьледчыкаў з усяго сьвету. Прывітаць гасьцей прыйшоў нават намесьнік міністра культуры РБ Валеры Гедройц. Ён адзначыў высокае значэньне «НН» пачатку стагодзьдзя ў адраджэньні і разьвіцьці беларускай культуры і пажадаў удзельнікам чытаньняў посьпехаў. Адкрыцьцё канфэрэнцыі фільмавалі рэпарцёры БТ.

Сярод ганаровых гасьцей чытаньняў былі доктар філязофіі зь Нью-Ёрку Янка Запруднік і прафэсар з Варшаўскага ўнівэрсытэту Аляксандар Баршчэўскі. Канфэрэнцыя супала ў часе з днём нараджэньня Янкі Запрудніка. Шаноўнаму госьцю споўнілася 70 гадоў. Янку Запрудніка павіншавалі дырэктар музэя Жана Дапкюнас ды іншыя ўдзельнікі імпрэзы. Падарункаў было так шмат, што юбіляр мусіў паклікаць на дапамогу сваю жонку Надзю, якая разам зь ім прыляцела ў Менск. У сваім выступе «Купаліна беларуская эміграцыя» госьць зь Нью-Ёрку адзначыў вялікую ролю «Нашай Нівы» у адраджэньні нацыянальнай ідэі ў XX ст, ролю Янкі Купалы, як рэдактара выданьня з 1914 году: «Купала і «НН» апынуліся ў цэнтры нашай увагі, як спосаб памятаць пра Беларусь вольную». Ад Беларускага Інстытута Навукі і Мастацтва ў Нью-Ёрку Янка Запруднік перадаў музэю рукапіс вершаў Янкі Купалы 1923 году.

На канфэрэнцыі было шмат цікавых дакладаў, паведамленьняў і дыскусіяў. Вось толькі некаторыя тэмы выступаў: «Янка Купала і «Наша Ніва» (да гісторыі трактовак)» (Алег Лойка), «Наша Ніва» ў сьвятле агульнабеларускага самасьцьвярджэньня» (Аляксей Каўка), «Польская літаратура на старонках «Нашай Нівы» 1906-1910» (Мечыслаў Яцкевіч), «Пецярбург на старонках «Нашай Нівы» (Валянцін Грыцкевіч), «Аляксандар Уласаў – рэдактар «Нашай Нівы» (Арсень Ліс), «Наша Ніва» і беларуская палітычная традыцыя» (Уладзімір Гніламёдаў).

«Не згаснуць зоркі ў небе» — так называлася выстава, якую наладзілі супрацоўнікі музэю для гасьцей і ўдзельнікаў сьвята, прысьвечаную гісторыі газэты.

Удзельнікі чытаньняў пасадзілі каля музэю Янкі Купалы дзьве расьліны з купалаўскага верша — явар і каліну, як сымбаль адзінства ўсіх беларусаў сьвету. Каліну садзіў Янка Запруднік, а явар – Аляксандар Баршчэўскі.

Дык хай жа растуць, хай цягнуцца ўгару іх галінкі насустрач сонцу.

Тацяна Чуйвід

Другое «предупреждение»

Днямі рэдакцыя «НН» атрымала зь Дзяржкамдруку другое «Предупреждение о нарушении Закона «О печати и других средств массовой информации».

Тэкст ліста мала чым адрозьніваецца ад папярэдняга. Тыя самыя граматычныя памылкі, тая самая расейская мова і тое самае неназываньне канкрэтнага тэксту, у якім, нібыта, быў парушаны закон.

«В газете «Наша Нива» за 16.09.96 - 22.09.96 № 24 опубликованы стихи, в которых имеются нарушения ст.5 часть 3 и 4 Закона «О печати и других средств (так у арыгінале. — «НН») массовой информации». Государственный комитет Республики Беларусь по печати напоминает Вам на (так у арыгінале. — «НН») неоднократное нарушение Закона и предлагает принять меры по неукоснительному соблюдению законодательства. Председатель В.П.Бельский».

Нагадаем, што падобныя лісты атрымліваюць і іншыя незалежныя выданьні. Сутнасьць гэтай вайны з прэсай у тым, каб паставіць усю недзяржаўную прэсу на юрыдычную «лінейку гатоўнасьці» да забароны. Рэч у тым, што двух «предупреждений» дастаткова для таго, каб Дзяржкамдрук мог накіраваць зыск у суд аб закрыцьці пэрыядычнага выданьня. Але такога зыску можа і ня быць. Усё залежыць ад жаданьня А.Лукашэнкі. Калі ён, напрыклад, „дасьць каманду" забараніць усе незалежныя выданьні, то Дзяржкамдрук зробіць гэта адразу і «на падставе закону». Маўляў, мы ж вас ужо двойчы папярэджвалі.

Пра што яны нас папярэджваюць, можна толькі здагадвацца. Хутчэй за ўсё — пра паэтычныя творы нашых чытачоў, якія друкуюцца на старонцы вершаванага радка «Грамафон». Друкуюцца, заўважым, без цэнзуры. Многія аўтары гэтай старонкі (а іх, аўтараў, дзясяткі) недалюбліваюць прэзыдэнта А.Лукашэнку і пішуць пра гэта ў эмацыйнай форме. Што зробіш, беларусы —нацыя паэтаў, што думаюць, тое і пяюць. Паколькі рэдакцыя свабоднага выданьня ня ставіць сваёй задачай уводзіць цэнзуру, нам застаецца толькі заклікаць аўтараў «Грамафона» словамі зь верша Сержука Сокалава, які таксама друкаваўся ў «НН»: «Любі прэзыдэнта!»

Н.Н.

Новыя банкноты



4 кастрычніка ў прыватнай Галерэі сучаснага мастацтва «6 лінія», якая належыць ЗАТ «Белтэхналёгія і М», адкрылася выстава Цімоха Ізотава «Новыя грашовыя банкноты, альбо Беларускі рэалізм».

Трынаццаць «купюраў», якія так нагадваюць сучасныя беларускія грошы, выкананыя ў тэхніцы алейнага жывапісу на халсьце «сур'ёзнага» фармату.

Выставу, якую падтрымаў Беларускі Фонд Сораса, не абышлі ўвагай. Найперш, дырэкцыя забараніла выставіць адну з «банкнотаў», на якой фігураваў вусаты пэрсанаж сярод дзяцей. Крыху пазьней быў «выкрыты» подпіс на другой «купюры» — «Тимофей Винников». Подпіс загадалі зацерці і ад яго засталося толькі «Т.». Аднак, канцэптуальная праграма аўтара праекту засталася ўсё ж на паверхні — нумарная сэрыя купюраў «L&M». Кожны, хто чытае ня толькі дзяржаўную прэсу і заўважае гандлярак цыгарэтамі ў пераходах, бязь цяжкасьці пазнае ініцыялы літаратурнага пэрсанажа з паэмы «Лука Мудзішчаў», якая ў свой час нарабіла шуму, дзякуючы публікацыі ў газэце «Свабода».

Цімох Ізотаў пасьля сканчэньня Менскай мастацкай вучэльні доўга шукаў сябе ў розных жанрах і ў розных краінах, аднак менавіта «тутэйшы канцэптуалізм» сёньня прынес яму пэўны посьпех.

Але няўжо дзеля таго, каб мы нешта стварылі, ухутвалі думкі ў сувой мэтафараў, вывяралі кожны штрых і кожную літару, нам патрэбны таталітарны плот з забаронаў і забабонаў? Бадай, ня ў тым сутнасьць гэтай акцыі. Сутнасьць у тым, што яе стварыў абсалютна свабодны і абсалютна тутэйшы чалавек для свабодных тутэйшых людзей.

Сяргей Харэўскі

Прысутнасьць

Франкфурцкі кніжны кірмаш

У беларускай прысутнасьці на Франкфурцкім кніжным кірмашы не было анічога нечаканага: дзяржаўныя выдавецтвы на чале зь Бельскім выехалі дэманстраваць дасягненьні, недзяржаўныя паехалі працаваць — выкупляць правы на выданьні, шукаць новыя кніжкі й кніжныя сэрыі.

Пра дамовы й перамовы звычайна ня пішуць, пішуць пра сьвята. Сьвятам (тэмай) сёлетняга кірмашу сталася «Ірляндыя і яе дыяспара», сымбалічнай выявай — постаць Гулівэра. Таму, выканаўшы праграму сустрэчаў і прыгадаўшы свае функцыі сябра-заснавальніка Беларуска-Кельцкага Зьвязу, я пацягнуўся ў Ірлядзкі павільён.

Першае, што я зразумеў — гэта тое, што сьвет бязьлітасны. Нягледзячы на сваю ўяўную цэнтральнасьць, ірляндшчына на кірмашы была цалкам маргінальнай. Усе правы на ірляндзкіх герояў — ад Ейтса і Джойса да Шэймаса Хіні —належаць ангельскім ды амэрыканскім выдавецтвам. Самі ірляндцы могуць прапанаваць няшмат. І таму, у той час, як побач Фабэр энд Фабэр пасьпяхова гандляваў паэзіяй Хіні, мы сядзелі зь Micheal O Conghaile і абмяркоўвалі ірляндзкі прарыў у беларускай літаратуры. Дамовы былі фантастычныя: прэзэнтацыя ірлядзкае музыкі на беларускім недзяржаўным радыё, гранты на пераклад ірляндзкае клясыкі, стажыроўкі дзеля вывучэньня ірляндзкае мовы. У знак сур'ёзнасьці намераў Micheal паступова закладаў мяне кнігамі й кампактамі.



Кнігі, каталёгі, рэклямкі, дамовы, сустрэчы, разьвітаньні, пляны — усё невераѓодным цяжарам упакоўваецца ў невялічкую торбу. А потым:

Слодыч вяртаньня
На вышыні пяць кілямэтраў

Між канцом і пачаткам
Словам і марай
Сном — абуджэньнем

More vine, кажу я
бортправадніцы

На вуснах — забытыя вершы
У сэрцы аблокі
Перад вачыма

Patria morta

Ігар Бабкоў

Маладыя кансэрватары Эўропы

Маладыя кансэрватары ў Беларусі — гэта Маладзёжная Арганізацыя БНФ. Днямі старшыня гэтага згуртаваньня Алесь Касач вярнуўся з паездкі ў Заходнюю Эўропу.

Галоўная мэта паездкі — даць інфармацыю пра парушэньні правоў чалавека ў Беларусі. Дзеля гэтага А.Касач сустрэўся ў Нідэрляндах з прадстаўнікамі «Гарадзкой партыі» і «Зялёнай партыі», якія маюць дэпутатаў у парлямэнце, а таксама з кіраўніцтвам гарадзкой Рады Эйндховэна. Пасьля гэтага старшыня МА БНФ накіраваўся ў Вялікабрытанію, на канфэрэнцыю «Свабода'96», якую ладзілі Маладыя Кансэрватары Эўропы (МА БНФ з пачатку гэтага году — сябра МКЭ) і Міжнародная Дэмакратычная Маладзёжная Злучанасьць. Галоўныя тэмы канфэрэнцыі: пагроза ўсё яшчэ жывога камунізму і праблема абароны правоў чалавека, у прыватнасьці ў правінцыі Косава і ў Беларусі.

Тут жа, на канфэрэнцыі адбылася сустрэча з буйнымі палітыкамі Брытаніі, сярод якіх быў і прэм'ер-міністар Джон Мэйджар. Але найбольш грандыёзнай падзеяй у Лёндане была «Вячэра Свабоды» з Лэдзі Тэчар. Алесь меў з баранэсай кароткую размову, падчас якой яна выказала сваю занепакоенасьць парушэньнямі правоў чалавека ў Беларусі, а напрыканцы гутаркі пажадала посьпехаў Народнаму Фронту. У доказ усяго сказанага А.Касач прывез памятны здымак, дзе ён адлюстраваны разам з М.Тэчар.



Ф.

Кніжка для экзыстантаў

Калі з развалам Саюзу адыйшлі ў гісторыю бібліятэчныя сэрыі накшталт «Жизнь замечательных людей» або «Бібліятэка юнага ленінца», бібліяфілы, мабыць, моцна засумавалі. Але перабудова з размахам кампэнсавала аматарам чытаньня сэрыялы пра камсамольцаў і нэграў-інтэрнацыяналістаў, прапануючы ім усё новыя і новыя праекты. Напрыклад, бібліятэчная сэрыя «Пламенные реакционеры», якую выдае расейскі фашыст Жарыкаў і зь якой можна шмат даведацца пра жыцьцёвы шлях Пінача або ідэоляга расызму Чэмбэрлена. Або, напрыклад, сэрыя «Жизнь выдающихся демократов», якую заснаваў у Маскве лідар Кансэрватыўнай партыі Л.Убожко. Напэўна, Вы здагадваецеся, што сэрыю адкрыла біяграфія самога Убожко. І вось цяпер на кніжным рынку — новая кніжная сэрыя: «Бібліотека юного підпільника», якую выдае УНА-УНСО. Першая кніжка сэрыі — «Цитатник экзистанта УНСО», надрукаваная, як указана на форзацы «Іволгінскім дацаном м. Улан-Уде» накладам 1 млн. асобнікаў.

У Беларусі гэтая нязграбная брашурка ў 14 старонак можа адразу прэтэндаваць на статус бібліяграфічнай рэдкасьці. Яе ўвогуле нельга купіць (дарэчы, яе намінальны кошт — 20 кап.). Акрамя таго, як і ўся літаратура УНСО, распаўсюджваецца яна нелегальна.

Трошкі пра зьмест. Тэкст кніжкі (па аналёгіі з «чырвонай кніжачкай» Мао Цзэ Дуна яе можна назваць «шэрай кніжачкай» Дзімы Карчынскага) уяўляе сабою каля 100 цытат самага рознага экстрэмісцкага кшталту. Прыкладам, з Бакуніна: «Разбурэньне — творчае пачуцьцё», з Мао: «Вінтоўка нараджае ўладу», з фашыстаў: «Нацыя па-над усім». Ёсьць і пэрлы рэвалюцыйнай мудрасьці: «Ручонкі на прылавок!»

Разьлічана кніжка на інфантыльных падлеткаў, якія жадаюць самасьцьвердзіцца, і на журналістаў Беларускага Тэлебачаньня. Можна ўявіць сабе тэлевізійны ролік з панарамай апазыцыйнай маніфэстацыі і голасам за кадрам: «Што могуць даць народу гэтыя людзі, якія кіруюцца прынцыпам: «Мы ня маем патрэбы ні ў якай дыялектыцы, акрамя дыялектыкі нажоў і пісталетаў»?!



Наступная кніжка, якая павінна выйсьці ў сэрыі «Бібліотека юного підпільника» называецца «Падставы куртуазнага каханьня». Пачытаем.

Лёлік Ушкін

KALANDAR

14 kastryčnika

U hety dzień... naradziŭsia Dwight David Eisenhower (1890-1969),amerykanski heneral, jaki byŭ kamandziram vojskaŭ aljantaŭ u časie druhoj suśvietnaj vajny i staŭ 34-m prezydentam USA.

15 kastryčnika

U hety dzień... u 1582 h. hryharyjanski kalandar (abo -- novy styl) byŭ uviedzieny ŭ Italii, Francyi, Hišpanii i Partuhalii; takim čynam diesiać dzion pamiž 5 i 14 kastryčnika byli srtačanyja dla historyji.

U 1917 h. halandzkaja tancorka Mata Hari była rasstralanaja francuzami za špijonstva na karyść niemcaŭ.

Naradzilisia: rymski paet Virgilius (70-19 d.n.e.) i Friedrich Wilhelm Nietzsche (1844-1900).

16 kastryčnika

U hety dzień... u 1946 h. byli paviešanyja dziesiać vajennych złačyncaŭ:Frank, Frick, Jodl, Kaltenbrunner, Keitel, Ribbentrop, Rosenberg,Sauckel, Streicher i Seyss-Inqart. Adzinaccaty, Hermann Goering skončyŭ samahubstvam za kolki hadzinaŭ pierad ekzekucyjaj.

Naradzilisia: amerykanski leksykohraf Noah Webster (1758-1843), imiem jakoha nazyvajuć pieršy poŭny amerykanski słoŭnik anhielskaj movy; Oscar Wilde (1854-1900), irlandzki paet i dramaturh; David Ben-Gurion (1886-1973), pieršy premjer Izraela; niamiecki piśmieńnik Günter Grass (1927).

17 kastryčnika

U hety dzień... uviedzieny ŭ dziejańnie Statut Vialikaha Kniastva Litoŭskaha 1588 h.

18 kastryčnika

U hety dzień... naradzilisia: Henrie Bergson (1859-1941), francuski filozaf, laŭreat Nobeleŭskaj premii ŭ halinie litaratury za 1927 hod i tenisystka Martina Navratilova (1956), jakaja dzieviać razoŭ vyjhravaławimbledonski turnir.

19 kastryčnika

U hety dzień... u 1988 h. u Miensku stvorana respublikanskaje histaryčna-aśvietnaje tavarystva pamiaci achviaraŭ stalinizmu"Martyraloh Biełarusi" i arhkamitet BNF.

20 kastryčnika

U hety dzień... naradzilisia: francuski paet Artur Rimbaud (1854-91) iVacłaŭ Łastoŭski (1883-1938).

МІЖНАРОДНЫ КАМЭНТАР

Не такі страшны той шарыят...

Як толькі правальваюцца пляны нейкай звышдзяржавы ў пэўнай ісламскай краіне, адразу ж мас-мэдыя ўсяго сьвету поўняцца страшылкамі пра сарацынаў, што зьдзекуюцца самі зь сябе, уводзячы крывавыя законы шарыяту. Прыгадваюцца найперш Альжыр, Чачэнія і цяпер вось Аўганістан.



Францыя вельмі абурылася ў свой час намерамі Ісламскага фронту выратаваньня ў Альжыры накінуць на кабет чадру. Так абурылася, што ажно пасадзіла пільнаваць недапітую магрыбскую нафту найбольшых фэміністаў, якіх толькі адшукала ў краіне — генэралаў. Не прапала дарэмна выхаваньне найлепшых францускіх акадэміяў: і генэралы, і палкоўнікі гінуць, але права на загар на мілых абліччах не здаюць. За загар загінулі ўжо 40.000 чалавек.

У паведамленьнях пра ісламскае права ў Чачэніі цнатліва прапускалі, што ўвялі яго выключна для чачэнскіх мілітантаў. Вядома ж, калі б у расейскім войску адсякалі руку... Вялікія нацыі заўсёды ганарацца тым, што нясуць сьвятло для недаразьвітых народаў.

На мінулым тыдні ніхто на сьвеце яшчэ ня ўцяміў, што там адбылося, у Аўганістане, але магічны бука-красналюдзік шарыяту ўжо павандраваў з экрана на экран. На другі плян адыйшоў боль Аўганістану, расшматкаванага на дробныя фэоды, што ліквідуе ўсякую магчымасьць для разьвіцьця. Не заўважалася праблема Аўганістану як крыніцы наркаманіі і наркамафіі ў Эўропе. Маўчаньне пра тое, чыёй зброяй ваююць нашы і вашы. Усім у вочы ўбіўся шарыят.

У наступным годзе ў выдавецтве «Эўрафорум» мае выйсьці славутая кніга Мішэля Фуко «Гісторыя злачынства». Грамадзтва не заўсёды ставілася да злачынства і пакараньня так, як сёньня. І калі сёньня сорак бізуноў па сьпіне за п'янства здаюцца зьдзекам з асобы, дык некалі нашы нашчадкі будуць дзіву давацца: як гэта маглі чалавека пазбавіць СВАБОДЫ? Жыхары Галіцка-Валынскага княства, у тым ліку і продкі сучасных берасьцейцаў, можа, і ўявіць сабе не маглі, як гэта чалавека могуць пакараць сьмерцю. Гэтаксама героям Дуніна-Марцінкевіча сорак бізуноў на дыване менш балелі, чым дваццаць без дывана. Паводле шарыяту ліхадзею адсякаюць руку, а згодна з крымінальным кодэксам злодзею праз турэмны рэжым выводзяць са строю лёгкія, ныркі, страўнік... Адно на адно.

Можа, шарыят прывучае чалавека да зьверстваў? Талібы павесілі Наджыбулу, і іх за гэта алах пракляне, але й найхрысьціянейшыя румыны застрэлілі Чаўшэску. На жаль, страце людзьмі чалавечага аблічча спрыяе дыялектыка гісторыі. Помніцца, як у 1991-м дэманстранты аплёўвалі дэпутата Ціхіню...

Эўрапейцу шарыят здаецца прывідам уласнага ўбогага мінулага. Мулы разбураюць падмурак функцыянаваньня аўганскай дзяржавы, у якой мужчыны ваявалі, а жанчыны шчыравалі, — забараніўшы другому полу працаваць. Перад прыходам талібаў жанчыны складалі тры чвэрці службоўцаў дзяржаўнага апарату...

Ташкент і Масква падбухторваюць узбэкаў Мазары-Шарыфа да незалежнасьці. Расейская зброя шырокай хваляй ліецца ў студні тых, хто нядаўна ваяваў супраць Расеі. І раптам стала незразумела, хто ў гарах галоўны: ці то Вашынгтон, ці то Ісламабад, ці то прарок Магамэт.

Шэсьць мулаў з найвышэйшае рады талібаў хочуць канчаткова прымусіць усіх аўганцаў жыць паводле Карану. Пры гэтым — во дзіва! — толькі тая жменька мулаў і валодае арабскай мовай, а астатнія вучні духоўных школ ведаюць Каран толькі на слых, як паўпісьменныя сярэднявечныя манахі, што паўтаралі модлы напамяць, ведаючы іхні сэнс толькі прыблізна, ад настаўнікаў.

Гледзячы на гэтых дзяцей Алаха, яшчэ раз разумееш, што шарыят ня толькі кансэрвуе сярэднявечны лад. Шарыят яшчэ й вучыць: найперш адказнасьці за свае ўчынкі і годнасьці. Наша эўрапейская цывілізацыя адорвае свабодай і прасторай для самарэалізацыі. Але безадказнасьць робіць са свабоды малапрыцягальны



сымбаль, грандыёзны, як вялізная здэвальваваная банкнота з мноствам нулёў. Халуйства зьнішчае пэрспэктывы самарэалізацыі.

Шарыят дае чалавеку веру і ўтрапёнасьць. Той, хто верыць, ведае: трэба баяцца не сінякоў — трэба баяцца страху, бо страх — гэта сьмяротны грэх.

Андрэй Дынько

№ 28/96

14-20 кастрычніка

ІНФАРМАТАР

НАША НІВА

Новае слова на рынку беларускае прэсы — штотыдзень 8 палосаў патрэбнае інфармацыі

ШТОТЫДНЁВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ДАДАТАК ДА ГАЗЭТЫ НАША НІВА

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ BELARUSIAN PUBLIC RELATIONS ASSOCIATION

ДЫПЛЯМАТЫЧНЫ КОРПУС У МЕНСКУ

11. **Пасольства Ўкраіны Адрэса**: вул.Кірава, 17. Тэлефон: 27-70-04, 27-28-61. Факс: 27-28-61. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп.Уладзімер Іванавіч Жаліба.

12. **Пасольства Расейскай Фэдэрацыі** Адрэса: вул.Старавіленская, 48. Тэлефон: 50-36-65, 50-36-66, 34-63-56. Факс: 50-36-64. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Ігар Аляксандравіч Сапрыкін.

13. **Пасольства Латвійскай Рэспублікі** Адрэса: вул.Старажоўская, 15, гатэль "Беларусь", 19-ы паверх. Тэлефон: 39-16-12. Факс: 50-67-84. Тэлекс: 252618 LATRB SU. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп.Яніс Лоўнікс.

14. **Пасольства Японіі** Адрэса: вул.Энгельса, 13, гатэль "Акцябарскі". Тэлефон: 27-47-18. Факс: 27-43-19. Паверaны ў справах сп. Акіра Татэяма.

15. **Пасольства Вялікабрытаніі** Адрэса: вул.К.Маркса, 37. Тэлефон: 29-23-03/04/05. Факс: 29-23-06. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп.Джэсыка Пірс.

16. **Пасольства Кыргыскай Рэспублікі** Адрэса: вул.Старавіленская, 57. Тэлефон: 34-91-17, 34-40-38. Факс: 34-16-02. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Барубэк Чыйбылавіч Ашыраў.

17. **Пасольства Літоўскай Рэспублікі** Адрэса: вул.Варвашэні, 17. Тэлефон: 76-94-73, 34-77-84, 34-42-64. Факс: 76-94-71. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Віктарас Баўбліс.

18. **Пасольства Дзяржавы Ізраіль** Адрэса: Партызанскі пр., 6а. Тэлефон: 30-44-44, 30-42-98, 30-34-79. Факс: 8-017-2-10-52-70. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп.Эліяху Валк.

19. **Пасольства Рэспублікі Малдова** Адрэса: "Дразды", лецішча 32. Тэлефон: 50-39-52, 50-57-06. Факс: 50-65-73. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Іон Лешану.

20. **Пасольства Рэспублікі Арменія** Адрэса: вул.Кірава, 17. Тэлефон: 22-30-72, 27-51-53. Факс: 23-13-21, 27-23-39. Паверaны ў справах сп. Спартак Ерыносавіч Кастанян.

21. **Пасольства Рэспублікі Казахстан** Адрэса: вул.Іванаўская, 56. Тэлефон: 35-59-43, 35-82-41, 36-20-61, 36-94-01, 29-30-83. Факс: 35-84-52. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Валеры Батаевіч Цемірбаеў.

22. **Нунцыят Сьвятога Прастола** Адрэса: вул.Заслаўская, 25-242. Тэлефон: 23-47-27. Факс: 26-90-92. Апостальскі Нунцый.

23. **Пасольства Чэскай Рэспублікі** Адрэса: Бранявы зав., 5а. Тэлефон: 36-42-44, 36-34-50. Факс: 36-74-35. Часовы Паверaны ў справах сп. Душан Даскачыл. Гандлёвае прадстаўніцтва: Тэл.:36-94-11.

24. **Пасольства Туркмэністана** Адрэса: вул.Кірава, 17, к.116. Тэлефон: 22-34-27. Факс: 29-33-67. Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол сп. Ільля Вяльджанавіч Вяльджанаў.

Генэральнае Консульства Рэспублікі Польшча ў Гародні Адрэса: г.Гародня, вул.Будзёнага, 48а. Тэлефон: 96-74-69. Факс: 44-85-17. Генэральны консул сп. Марыюш Машкевіч.

Генэральнае Консульства Расейскай Фэдэрацыі ў Берасьці Адрэса: г.Берасьце, вул.Вароўскага, 19. Тэлефон/факс: (01622) 5-56-70. Генэральны консул сп.Анатоль Мікалаевіч Корсун.

Генэральнае Консульства Эстоніі ў Менску Адрэса: г.Менск, вул.Варвашэні, 17. Тэлефон: 34-64-86. Факс: 10-12-60. Генэральны консул сп.Уладзімер Ф. Рэдлап.

Генэральнае Консульства Славацкай Рэспублікі ў Менску Адрэса: г.Менск, прасп.Пушкіна, 39, гатэль "Арбіта", 12-ы паверх. Тэлефон: 57-78-52/53. Факс: 57-78-50. Генэральны консул сп. Ізідор Пачыатэк.

Консульства Латвійскай Рэспублікі ў Віцебску Адрэса: г.Віцебск, вул.Леніна, 69. Тэлефон: 36-58-54. Факс: 37-01-40. Віцэ-консул сп. Крузэ Армандс.

Консульства Рэспублікі Польшча ў Берасьці Адрэса: г.Берасьце, вул.Крупскай, 14, гатэль "Веста". Тэлефон: (01622) 3-62-78. Факс: 80-64-24. Консул сп. Ежы Рыхлік.

Прадстаўніцтва ААН/ПРААН Адрэса: г. Менск, вул.Кірава, 17. Тэлефон: 27-48-76, 27-81-49. Факс: 26-03-40. Прадстаўнік сп.Павел Крал.



ТЭСТ: **кухонныя камбайны**

Нямецкая кампанія па вывучэньню спажывецкіх якасьцяў розных тавараў Штыфтунг Варэнтэст правяла выпрабаваньні 23 кампактных кухонных камбайна па коштах ад 130 да 350 нямецкіх марак. Амаль усе мадэлі атрымалі адзнаку "добра", толькі некаторыя зь іх былі сапраўды бездакорнымі. Якія?

Чытайце **СТАР. 10**

Бясплатныя прыватныя абвесткі

КАНТАКТЫ

Шукаю маладых беларускіх патрыётаў з г. Стоўбцы і раёну. Аляксей Шыдлоўскі 222660 г.Стоўбцы, зав.Стадыённы, 7

НАДРУКУЕМ ПАМНОЖЫМ

Хутка — **1.000** особнікаў за 10 хвілінаў. Танна — ад 108 рублёў за копію.

БЛЯНКІ, ВІЗЫТОЎКІ, РЭКЛЯМОВЫЯ ДЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ЎЛЁТКІ.

На паперы якое заўгодна шчыльнасьці і на картоне.

Тэл. 39-78-49

Перамотка й рэпарацыя электрарухавікоў (таксама ад дрыляў, пыласосаў). ГАРАНТЫЯ. Тэл.231-98-56

ШУКАЮ ПРАЦУ

Электронік, сыстэмамэханік, праграміст — рэпарацыя, абслуга ПК і пэрыфэрыі; ASM86, Pascal, FoxPro, English.

Тэл. 364-518

ТРАНСПАРТ

Грузапасажырскія перавозкі мікраўтобусам "Мэрсэдэс-207Д" (1,5 т), Літва, РБ, РП, Чэхія, Ліцэнзія.**тэл.254-67-39**

ПРАФЭСІЯНАЛЫ

Спэцыяліст: кансультацыі, справаздачы прадпрымальнікам. 249-76-54 пасьля 17.00. Яна.

ВІНШУЮ!

Віншуем Алену Сьцяпанаву (г.Ворша) з пасьпяховай здачай іспыту. Наста, Зьміцер і Гойша.

Прадаю запісы Алена, Андруся Мельнікава, Данчыка, Ліцьвіноў, "Нейродюбель" і інш. Тэл. 490-888

ВІНШУЕМ

Юры БАБУРЫНА з днём нараджэньня, жадаем посьпехаў ва ўсім!

ДЗЯКУЙ

Вялікі дзякуй усім паэтам за іх цудоўныя вершы ў "Грамафоне". Счасная Натальля

МАЛАДЫ МУЖЧЫНА (30), ЖУРНАЛІСТ, ШУКАЕ ЮНАКА-АДНАДУМЦУ ДЛЯ ТРЫВАЛАГА СЯБРОЎ-СТВА. 210027, ВІЦЕБСК-27, А/С 24

Запрашаем

у беларускамоўнае асяродзьдзе для зьняцьця нерашучасьці ва ўжываньні роднай мовы. Даведкі штосерады з 18 да 20 гадзінаў. Тэл. 265-74-12

Бугальтар з досьведам працы і веданьнем кампутара прапануе свае паслугі. Тэл.2-264-263

Прадаю

Прадам 2-пакаёвую кватэру ў цэнтры Смаргоні, 4-ы паверх, 32 м2. Смаргонь, тэл.3-62-62

Матэматыка. Індывідуальная падрыхтоўка ў БДУ і БДЭУ. Кансультацыі студэнтам. Праводзіць дацэнт. Тэл. 226-78-19

Куплю старыя фотаапараты. Тэлефон у Кобрыні: **7-17-76 (01642).**

ПЕРАКЛАДЫ

Ангельская, расейская, польская, баўгарская мовы: *пераклады якой заўгодна складанасьці, індывідуальныя заняткі.* Тэл. 221-24-81

НАВАПОЛАЦАК, ТЭЛ. 211440 ПАЭЭТ, СТУДЭНТ. ПАЗНАЁМЛЮСЯ З АДЗІНОКАЙ БЕЛАРУСКАМОЎНАЙ ДЗЯЎЧЫНАЙ БЯЗ ШКОДНЫХ ЗВЫЧАК. РАЗМАЎЛЯЮ ТОЛЬКІ ПА-БЕЛАРУСКУ.

Прафэсійны перакладчык ангельскай/расейскай/беларускай, студэнт магістратуры інязу, з досьведам працы, рэкамэндацыямі, кампутарам, пасьведчаньнем мэнэджэра. Тэл. 268-88-80.

Чакаю лістоў ад Хлопцаў (18-25), якія жадаюць знайсьці сябра-мужчыну. Germany, ost-action, Petter Kern Post Each 100705 D-69447 Weinheim.

ЗДАРОЎЕ

Бясплатная псыхалягічная дапамога пры дэфіцыце плённых стасункаў, духоўнай адзіноце. Даведкі праз тэл. 265-74-12 штосерады з 18 да 20 гадзінаў. Зьвяртацца пасьля 23 верасьня.

Катэдж ў г.п. Радашковічы, жылы, усе камунікацыі, тэлефон, дзялянка 30 сотак — мяняю на кватэру ў Менску альбо прадаю. Тэл. (273) 94-5-30

КУПОН

Бясплатнай прыватнай абвесткі

Імя і прозьвішча ______

Адрэса, тэлефон ______

Тэкст: ______

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. НАША НІВА

220123, Менск, а/с. 71

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусі
АБАНЭМЭНТ на газэту **63125**

НАША НІВА

Колькасьць камплектаў ____

На 1996 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ______ (паштовы індэкс) (адрэса)

Каму ______ (прозьвішча, ініцыялы)

ДАСТАЎНАЯ КАРТКА на газэту **63125**

НАША НІВА

ПВ	месца	Літэр

Кошт	падпіскі	______ руб.	Колькасьць камплектаў	
	перaадрас.	______ руб.		

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ______ (паштовы індэкс) (адрэса)


Каму ______ (прозьвішча, ініцыялы)

СЬВЕТ ЗА ТЫДЗЕНЬ

ПАНЯДЗЕЛАК, 7 КАСТРЫЧНІКА:

Ірляндзкая рэспубліканская армія (ІРА) правяла тэрарыстычны акт на тэрыторыі ангельскай вайсковай базы пад Бэлфастам. Дзьве бомбы, якія баевікам удалося закласьці на тэрыторыі базы, выбухнулі адна за адной з прамежкам у 10 хвілінаў. Параненыя больш за 30 чалавек.

Выбары ў парлямэнт прайшлі ў ***Кувэйце***. Ісламісты розных накірункаў атрымалі прыкладна палову з 50 месцаў у парлямэнце. Права голасу ў Кувэйце маюць толькі мужчыны ва ўзросьце старэй за 20 гадоў.



Тэлевізійныя дэбаты паміж ***Білам Клінтанам і Робэртам Доўлам*** прайшлі ў Хартфардзе. Істотна на рэйтынгі кандыдатаў у прэзыдэнты яны не паўплывалі: 92 працэнты апытаных рэспандэнтаў заявілі, што дэбаты не зьмянілі іх стаўленьня да кандыдатаў.

Сакратар Рады бясьпекі Расейскай Фэдэрацыі ***Аляксандар Лебедзь*** прыбыў з афіцыйным візытам у штабкватэру NATO ў Брусэлі. Гэта першы ягоны выезд за межы былога СССР.



Узнагароду Нобэля ў мэдыцыне за 1996 атрымалі аўстраліец **Пітэр Дохерці і швайцарац Рольф Цынкернагель**. Такім чынам былі адзначаныя іх дасьледаваньні таго, як імунная сыстэма чалавека пазнае клеткі, закранутыя вірусам.

АЎТОРАК, 8 КАСТРЫЧНІКА:



У ***Італіі***, блізу Турыну, разьбіўся транспартны самалёт авіякампаніі "Аэрофлот" АН-124 "Руслан". Самалёт упаў на адзін з дамоў у вёсцы Сан-Францэскадэль-Кампа, калі заходзіў на пасадку на турынскі аэрадром "Казэле". Загінулі 2 пілёты і 2 селяніны, якія знаходзіліся ў доме. Гаспіталізавана больш за два дзясяткі пасажыраў. Самалёт мусіў перавесьці чатыры ўнікальных аўтамабілі для калекцыі султана Брунэя.



Рымскаму папу праведзеная апэрацыя на апэндыцыт. Апэрацыя, якую праводзіў праф.Францэска Кручыці (той самы, што выратаваў жыцьцё Яну Паўлу II пасьля замаху на яго ў 1981г.) заняла каля 50 хвілінаў. Лідар палестынскай аўтаноміі Ясір Арафат даслаў папу букет белых і чырвоных руж.

Прэзыдэнт Ізраіля **Вэйцман** прыняў лідара палестынцаў **Ясіра Арафата** на сваёй віле ў Цэзарэі. Гэта першы афіцыйны візыт Арафата ў Ізраіль. Па заканчэньні Вэйцман сказаў Арафату: *"Тэлефануй да мяне адразу, як толькі ўзьнікнуць якія праблемы"*.

Аляксандар Лебедзь заявіў у Брусэлі аб тым, што NATO мае права на прыняцьце новых сяброў і што Расея ня будзе з гэтай нагоды "біцца ў гістэрыцы".

Правадыр сапатыстаў віцэ-камандантэ **Маркас**, кіраўнік паўстаньня індзейцаў у штаце Чыяпас, якое выбухнула ў 1994 годзе, сустрэўся з прадстаўнікамі ўладаў Мэксыкі.



Рашыд Дустум сустрэўся з **Бурханудзінам Рабані** ў Мазары-Шарыфе. Узбэк Дустум і таджыкі Рабані і Ахмад Шах Масуд аб'ядноўваюцца супраць талібаў (пуштунаў па нацыянальнасьці).

Рашыд ДУСТУМ

СЕРАДА, 9 КАСТРЫЧНІКА:

У **Літве** пачаўся судовы працэс над арганізатарамі і ўдзельнікамі дзяржаўнага перавароту 13 студзеня 1991 года, пад час якога загінула 13 мірных жыхароў і сотні былі параненыя.Сярод галоўных падсудных: былы першы сакратар ЦК КПЛ (КПСС) Мікалюс Буракявічус і загадчык ідэалягічным аддзелам ЦК Юозас Ермалавічус, якія былі затрыманыя ў студзені 1994 года ў Менску летувіскімі спэцслужбамі. Апрача іх на лаве падсудных апынуліся: сакратар ЦК КПЛ (КПСС) Ю.Куаляліс, дырэктар партыйнага выдавецтва Л.Барташавічус, рэдактар радыё "Савецкая Літва" С.Міцкевіч і супрацоўнік МУС Літвы Я.Пракаповіч. Літоўскі суд ня здолеў прыцягнуць да адказнасьці астатніх удзельнікаў перавароту, якія зьбеглі ў Расею і Беларусь.



***Фільмы прадастаўленыя студыяй "TON video" т. (017) 233-92-30.*

ПРЫСАДА "ЗАЛАТОЙ АНТЫЛОПЫ"

Пасьля нечакана вялікай колькасьці кінаэкранізацыяў творчасьці Джэйн Осьцін, падобна, чарга дайшла і да другога клясыка ангельскай літаратуры Чарльза Дыкенса. Так, кінастудыя Fox пляную зьняць сучасную вэрсію яго рамана "Вялікія надзеі" (Great Expecations). Мяркуецца, што ў карціне будуць занятыя Робэрт Дэ Ніра і Гвінэт Пэлтроў. На ролю сучаснага Алівэра Твіста, каторы ў фільме мае імя Алівэра Джонса, запрошаны Куінсі Джонс.

Ходзяць чуткі, што Антоніа Бандэрас можа далучыцца да вядомага рэжысэра-прад'юсэра Сыднэя Полака ў працы над "Dark Grace". Фільм распавядае пра бразыльца, які раптоўна выяўляе, што валодае ацаляльнай сілай, якую яму дае дух доктара, што загінуў у Другую Сусьветную вайну.

Пасьля таго, як "Кранутыя прафэсар" (The Nutty Professor) аднавіў Эдзі Мэрфі ў правах караля камэдыі, актор з галавой паглыбіўся ў заключэньне выгадных кантрактаў на ўдзел у трох камэдыйных стужках. Рымэйк камэдыі 1963 году з Джэры Льюісам прынёс ягоным ствральнікам на сёньня больш за 115 млн. даляраў і паклаў канец няўдачам, што пераследавалі Мэрфі апошнія гады. Сам актар атрымаў за фільм 12 млн. даляраў. Зараз у ягоныя намеры ўваходзіць удзел у праектах "Доктар Дулітл" (Dr Dolittle), "Сьвяты чалавек" (Holy Man) і "Жыцьцё" (Life), камэдыя пра турэмнае жыцьцё двух сябрукоў. Паводле апошніх зьвестак, Мэрфі падпісаў кантракт, згодна зь якім за рымэйк "Д-ра Дулітла" ён атрымае ганарар у памеры 17 млн. даляраў.

Падобна, што Дэніэл Дэй Льюіс сыграе галоўную ролю ў новай карціне рэжысэра Джыма Шэрыдана пра спробы і памкненьні ірляндзкага баксэра стаць чэмпіёнам сьвету. Здымкі плянуецца пачаць у гэтым годзе, аднак фільм пакуль ня мае назвы.

Амэрыканскі рэжысэр Робэрт Зэмэкіс прыступае ў гэтыя дні да працы над экранізацыяй навукова-фантастычнага раману Карла Сагана "Кантакт" (Contact). Як паведаміла кампанія Warner Bros., жанчыну-астранома, каторая знаходзіць першыя доказы існаваньня прышэльцаў, будзе граць Джодзі Фостэр. Галоўная мужчынская роля аддадзеная будучай зорцы Галівуда Мэцью Маканахі.

Тэатры

15-21 кастрычніка

ТЭАТАР-СТУДЫЯ КІНАКТОРА

15 аўторак, 16 серада – Ю.Оснас. Нябачны сябар.

17 чацьвер, 18 пятніца – А.Галін. Карнавал у Вэнэцыі.

19 субота, 20 нядзеля – Л.Вэрнэйль. Выкраданьне Алены.

ТЭАТАР САТЫРЫ І ГУМАРУ "ХРЫСТАФОР"

18 пятніца, – Выбранае. Лепшыя нумары, створаныя за апошнія 10 гадоў. Да юбілею тэатра.

20 нядзеля – В.Пярцоў. Усе на прышчэпкі. Псыха-тэрапэўтычнае дзеяньне.

ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТАР МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

16 серада – Прэм'ера. О.Штраўс. Капялюш Напалеона. Апэрэта ў 2 дзеях.

17 чацьвер – І.Кальман. Марыца. Апэрэта ў 3-х дзеях.

18 пятніца – У.Кандрусэвіч. Шклянка вады. Мюзікл у 2-х дзеях.

19 субота – Ж.Бізэ – Р.Шчадрын. Кармэн-сюіта. Балет у адной дзеі. Канцэртная праграма.

20 нядзеля, ранак – П.Чайкоўскі. Дзіцячы альбом. Опэра ў 2-х дзеях.

20 нядзеля, вечар – І.Кальман. Прынцэса цырку. Апэрэта ў 3-х дзеях.

ДЗЯРЖАЎНЫ РАСЕЙСКІ ТЭАТАР ІМЯ М.ГОРКАГА

18 пятніца – М.Горкі. Букееў і кампанія... Драма пра каханьне ў 2-х частках.

17 чацьвер – Р.Мэрль. Мадам, мэсье і... Камэдыя ў 2-х частках.

19 субота – С.Бельцюкоў, О.Залётнеў. Блаславі нас, Госпадзе... Містэрыя.

20 нядзеля – Б.Слэйд. У будучым годзе, у гэты ж час. П'еса ў 2-х частках.

Для дзяцей

20 нядзеля – А.Восіпаў. Жылі былі дурні. Казка-буф у 2-х частках.

Малая сцэна

17 чацьвер – І.Бар-Іосэф. Цяжкія людзі, ці жаніх з Ерусаліма. Нешта накшталт камэдыі ў 2-х частках.

15 аўторак – А.Карпаў. Хто там? Мэлядраматычны дэтэктыў у 2-х частках. На матывы апавесьці М.Рабэра.

16 серада – Ж.-К.Брысьвіль. Вячэра. П'еса ў 2-х частках.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТАР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

16 серада – Ж.-Б.Мальер. Нежанаты мнагажэнец альбо залёты пана дэ Пурсаньяка. Камэдыя ў 2-х дзеях.

17 чацьвер – Р.Горын. Памінальная малітва. Камэдыя ў 2-х частках на матывы твораў Шолам-Алейхема.

18 пятніца – В.Дунін-Марцінкевіч. Ідылія. Пастараль у 2-х дзеях.

19 субота – У.Бутрамееў. Страсьці па Аўдзею (Крык на хутары. Народная драма.

20 нядзеля – А.Астроўскі. Лес. Камэдыя ў 2-х дзеях.

21 панядзелак – М.Захаранка. Паехалі!.. Набоская камэдыя ў 2-х дзеях паводле твораў М.Крапіўніцкага.

Для дзяцей

20 нядзеля – І.Карнавухава, Л.Браўсевіч. Пунсовая кветачка. Казка ў 2-х дзеях.

Малая сцэна

19 субота – Дж.Марэл. Сьмех лангусты. Трагікамічныя сцэны.

20 нядзеля – Э.Ганэска. Віват, імпэратар! Трагіфарс паводле п'есы "Крэслы"

ДЗЕ-Я

15, 16, 17 – 19.00 Прэм'ера камэдыі "Жаніцьба", М.Гоголь.


18, ПЯТНІЦА 14.00 "Барановы Кароль", У.Ковель. 15.30 /казка/

19, СУБОТА 19.00 "Антропас", І.Глушакоў.

тэст кухонныя камбайны

Штыфтунг Варэнтэст правяла выпрабаваньні 23 кампактных кухонных камбайна з коштамі ад 130 да 350 нямецкіх марак. Амаль усе мадэлі атрымалі адзнаку "добра", толькі некаторыя зь іх былі сапраўды бездакорнымі.

Кампактныя кухонныя камбайны больш унівэрсальныя ў параўнаньні з ручнымі электраміксэрамі, і больш танныя ў параўнаньні зь вялікімі кухоннымі камбайнамі. Пратэставаныя машыны могуць выкарыстоўвацца для ўзьбіваньня вяршкоў і яйкавых бялкоў, для замешваньня цеста, здрабненьня дробнай гародніны, зьмешваньня супоў, соўсаў і малочных кактэйляў, а таксама для прыгатаваньня сечаных арэхаў, зеляніны і мяса. Дзякуючы сваім маленькім памерам, ім заўсёды знойдзецца месца і ў самай невялікай кухні, разьлічаныя яны найперш для выкарыстаньня ў невялікай гаспадарцы. За выключэньнем камбайна ЕКА, усе мадэлі атрымалі добрую адзнаку, як мінімум, "добра". Дзьве мадэлі фірмаў Браўн і Сымэнс, а таксама падобныя да іх мадэлі (глядзі ніжэй) атрымалі адзнаку "вельмі добра", праўда, крыху завышаную. Бездакорных мадэляў вёльмі мала. Некаторыя камбайны цудоўна ўзьбіваюць вяршкі і бялок, не адмаўляюцца ад наразаньня бульбы і гуркоў вялікімі кавалачкамі. У іншых добра атрымліваецца апартнае цеста, але пры прыгатаваньні сечанай ялавічыны ўзьнікаюць складанасьці... Падумайце, пры выкананьні якіх работ вы часьцей за ўсё будзеце карыстацца кухонным камбайнам, і выбірайце мадэль, якая менавіта за гэтыя дзеяньні атрымала адзнаку "добра" ці "вельмі добра".



Дэталі і функцыянаваньне

Усе мадэлі дзейнічаюць паводле аднаго прынцыпу: на маторным блёку ўсталяваная чаша для перамешваньня, у якой пры дапамозе вялікага выгнутага нажа зьмешваюцца, узьбіваюцца, пракручваюцца ці пюруюцца розныя прадукты. У камплект уваходзяць разнастайныя дадатковыя насадкі для націраньня (на тарцы), шынкаваньня і перамешваньня.

Як правіла, чым болей дадатковых прыладаў — тым вышэй і кошт. Мадэлі Мулінэт 750, Дуатронік і Квэле, Прывэлег 066.771 маюць, напрыклад, сокавыціскалку для цытрусавых, камбайн Філіпс Стормэйстэр ХР 2890 —цэнтрыфугу для адцісканьня соку, а мадэлі Браўн Мульціпрактык 430 і Кэнвуд ФП 800 маюць насадку для наразаньня бульбы брусочкамі (бульба фры).

Як правіла, большасьць мадэляў працуе даволі шумна. І калі сьцены ў вашай кухні тонкія, а слых у суседзяў — добры, вам неабходны камбайн, які атрымаў у графе "шум пры працы" адзнаку "ціха". Ударныя нажы кухонных камбайнаў зь цягам часу затупляюцца, іх неабходна заточваць. У некаторых мадэляў нажы тупіліся вельмі хутка. Для першаснай сечкі мяса і ўзьбіваньня падыйдзе і тупы нож. Калі ж трэба зрабіць моцна здрабнёную гародніну ці мяса, то вынік у значнай ступені залежыць менавіта ад заточкі нажа.

Зручнасьць пры карыстаньні

Пры працы з кухонным камбайнам неабходна захоўваць асьцярожнасьць. Нажы і таркі вельмі вострыя і круцяцца зь вельмі вялікай хуткасьцю, таму пры загрузцы прадуктаў трэба карыстацца толькі спэцыяльнай лапаткай. Ні ў якім разе не прыціскаць прадукты пальцамі! Калі апрацоўваеце ў вялікіх колькасьцях мяса ці густое цеста, маленькія мадэлі кампактных кухонных камбайнаў пачынаюць вібраваць, ці ссоўваюцца па сталу, таму ня варта пакідаць іх пад час працы без нагляду. У астатнім жа пры эксплюатацыі гэтых кухонных прыбораў праблемаў не ўзьнікае. Большасьць мадэляў лёгка зьбіраецца, зручныя пры карыстаньні. Толькі чыстка насадак — справа крыху цяжкая і не зусім прыемная.

Ідэнтычныя паводле канструкцыі мадэлі

Словаспалучэньне "падобныя мадэлі" служыць для абазначэньня электрапрыбораў, якія ў тэхнічных адносінах ідэнтычныя. Напрыклад, прыбор быў скантруяваны адной фірмай, а прадаецца надалей іншымі фірмамі ўжо пад іхнымі маркамі. У іншых выпадках сам вытворца ствараe некалькі падобных мадэляў — напрыклад, стандартны электрапрыбор і прыбор клясы "люкс", каторыя пры аднолькавай якасьці адрозьніваюцца паміж сабой толькі абсталяваньнем і коштам. У некаторых выпадках адрозьненьне заключаецца ў фірмовым найменьні ці мадэлі адрозьніваюцца на колер корпуса. Як паказала тэставаньне, падобныя мадэлі ідэнтычныя ў тэхнічных і якасных адносінах, а адрозьніваюцца на выгляд і колькасьць дадатковых насадак. Для разумнага выбару зьвярніце сваю ўвагу пры пакупцы на тое, што ўваходзіць у камплект выбранай вамі мадэлі і ці патрэбна яно вам.

Нашая парада пакупніку

Якая мадэль падыходзіць вам найбольш, залежыць, як ужо казалася, у першую чаргу ад таго, што вы будзеце рабіць зь ягонай дапамогай. Самыя танныя мадэлі, якія атрымалі адзнаку "добра" і задавальняюць пакупніка па ўсіх параметрах,— гэта прыбор фірмы Філіпс Стормэйстэр ХР 2890 (кошт — каля 179 нямецкіх марак) і фірмы Браўн Мульціпрактык 95 УК95 (каля 169 нямецкіх марак). Аднак абедзьве гэтыя мадэлі працуюць зь вялікім шумам. Больш ціхія пры працы і такой жа якасьці мадэлі Сымэнс МК 30 211 (каля 230 нямецкіх марак), Сымэнс МК 30 201 (198 нямецкіх марак), Браўн Мульціпрактык 410 (280 нямецкіх марак) і Браўн Мульціпрактык 430 электронік (320 нямецкіх марак). Таму ўсе яны атрымалі адзнаку "вельмі добра". Трэба мець на ўвазе, што разам з ростам кошту, як правіла, павялічваецца і абсталяваньне прыбора дадатковымі насадкамі.


Умоўныя абазначэньні адзнак якасьці, прынятыя Штыфтунг Варэнтэст:

++ *Вельмі добра*
+ *Добра*
о *Задавальняюча*
\- *Зь недахопамі*
— *Зь вялікімі недахопамі*

Кожная адзнака якасьці складваецца з адзнак па асобных разьдзелах выпрабаваньняў. Яны маюць розную ўдзельную вагу пры вызначэньні агульнай адзнакі якасьці. Бо ня можа быць, каб пры ацэнцы якасьці, напрыклад, прайгравальніка кампактдыскаў, дзе самым важным зьяўляецца цудоўнае гучаньне, прыватная ацэнка на зручнасьць карыстаньня мела тое самае значэньне, як і ягоныя акустычныя ўласьцівасьці.


Бывае, што адмоўная ацэнка па асобным парамэтры прыводзіць да паніжэньня агульнай адзнакі якасьці. Гэта адбываецца ў тых выпадках, калі спажывецкая карыснасьць вырабу ў выніку гэтага недахопу значна скарачаецца. Штыфтунг Варэнтэст называе гэта "прабіўным эфэктам".

Для таго, каб правільна зразумець вынікі тэстаў і цалкам разабрацца ў табліцах, неабходна чытаць тэкст, што дадаецца да іх. Часта пытаньні чытачоў пры тлумачэньні табліцаў зьвязаныя менавіта з тым, што апошнія разглядаюцца без папярэдняга прачытаньня гэтага тэксту.









Мадэль	Moulinex Moulinette 350	Moulinex Moulinette 750 Duotronic	Moulinex Moulinette Universal electronic m.Mixer
Кошт у ням. марках ад...да	115-149	287-369	159-199
з прыладамі	139	349	199
Агульная адзнака якасьці	Добра	Добра	Добра
Дадатковыя заўвагі			
Тэхнічнае выпрабаваньне	добра	добра	добра
Шум пры працы	слабы +	слабы +	слабы +
Падаўленьне тэле- і радыёперадачаў	так	так	так
Трываласьць насадак да карозіі	добра +	добра +	добра +
Доўгатэрміновае выпрабаваньне	вельмі добра --	вельмі добра ++	вельмі добра ++
Трываласьць нажэй (заточка)	вельмі добра --	задавальняюча о	зь недахопамі -
Выпрабаваньне на бясьпеку	добра	добра	добра
Функцыянальнае выпрабаваньне	добра	добра	добра
Узьбіваньне вяршкоў і яйкавых бялкоў	задавальняюча о	добра -	задавальняюча о
Замешваньне цеста	добра +	добра -	добра +
Перамешваньне маянэзу і варанай гародніны	вельмі добра ++	добра -	добра +
Прыгатаваньне сечаных арэхаў, мяса, гародніны	вельмі добра ++	добра +	добра +
Нарэзка, шынкаваньне, праціраньне на тарцы	задавальняюча о	вельмі добра --	вельмі добра +
Зручнасьць пры карыстаньні	добра +	добра +	добра +

Мадэль	Philips Storemaster Electronic HR 2892	Philips Storemaster HR 2890	Siemens MK 35211 electronic	GEKA Kompakt-Kuchenmaschine
Кошт у ням. марках ад...да	199-219	169-199	229-300	
з прыладамі	199	179	270	129
Агульная адзнака якасьці	Добра	Добра	Добра	Зь недахопамі
Дадатковыя заўвагі	тэндэнцыя да "вельмі добра"			
Тэхнічнае выпрабаваньне	задавальняюча	задавальняюча	добра	задавальняюча
Шум пры працы	моцны *) -	моцны *) -	сярэдні о	моцны *) -
Падаўленьне тэле- і радыёперадачаў	так	так	так	так
Трываласьць насадак да карозіі	добра +	добра +	вельмі добра ++	добра +
Доўгатэрміновае выпрабаваньне	вельмі добра --	вельмі добра ++	вельмі добра --	вельмі добра --
Трываласьць нажэй (заточка)	вельмі добра ++	добра +	добра -	зь недахопамі -
Выпрабаваньне на бясьпеку	добра	добра	добра	зь недахопамі 1)
Функцыянальнае выпрабаваньне	добра	вельмі добра	добра	задавальняюча
Узьбіваньне вяршкоў і яйкавых бялкоў	задавальняюча о	добра +	добра -	задавальняюча о
Замешваньне цеста	добра +	добра +	добра +	задавальняюча о
Перамешваньне маянэзу і варанай гародніны	зь недахопамі -	вельмі добра ++	добра -	добра -
Прыгатаваньне сечаных арэхаў, мяса, гародніны	вельмі добра --	вельмі добра ++	добра -	зь недахопамі -
Нарэзка, шынкаваньне, праціраньне на тарцы	вельмі добра -	вельмі добра ++	вельмі добра --	добра -
Зручнасьць пры карыстаньні	добра	добра	добра	задавальняюча

Мадэль	Braun Multipractic 430 electronic UK 430	Siemens MK 30211	AEG KM 21 Finesse Plus	Braun Multipactic 120 UK 120	Braun Multipractic 95 UK 95	Kenwood FP 800	Krups Rotary 450 electronic	Krups Rotary 500 electronic
Кошт у ням. марках ад...да	298-339	199-268	188	218	159-219	139-179	279-299	189-199
з прыладамі	319	229	199	199	169	299	180	199
Агульная адзнака якасьці	Вельмі добра	Вельмі добра	Добра	Добра	Добра	Добра	Добра	Добра
Дадатковыя заўвагі	з нацяжкай	з нацяжкай	тэндэнцыя да "вельмі добра"					
Тэхнічнае выпрабаваньне	добра	добра	добра	задавальняюча	задавальняюча	добра	добра	добра
Шум пры працы	сярэдні о	сярэдні о	слабы +	моцны *) -	моцны *) -	сярэдні о	сярэдні о	слабы +
Падаўленьне тэле -і радыёперадачаў	так	так	так	так	так	так	так	так
Трываласьць насадак да карозіі	добра -	добра -	добра +	добра +	добра +	добра +	добра +	добра +
Доўгатэрміновае выпрабаваньне	вельмі добра ++	вельмі добра --	вельмі добра ++	вельмі добра ++	вельмі добра --	вельмі добра ++	вельмі добра --	вельмі добра --
Трываласьць нажэй (заточка)	вельмі добра ++	вельмі добра --	добра +	вельмі добра ++	вельмі добра --	вельмі добра ++	добра +	задавальняюча о
Выпрабаваньне на бясьпеку	добра	добра	добра	добра	добра	добра	добра	добра
Функцыянальнае выпрабаваньне	вельмі добра	вельмі добра	добра	добра	вельмі добра	добра	добра	
Узьбіваньне вяршкоў і яйкавых бялкоў	добра +	добра +	добра +	добра +	добра +	добра +	задавальняюча о	задавальняюча о
Замешваньне цеста	добра +	добра +	задавальняюча о	добра +	вельмі добра ++	добра +	добра -	вельмі добра ++
Перамешваньне маянэзу і варанай гародніны	вельмі добра --	вельмі добра --	добра -	вельмі добра ++	вельмі добра ++	добра +	вельмі добра ++	зь недахопамі -
Прыгатаваньне сечаных арэхаў, мяса, гародніны	вельмі добра ++	вельмі добра ++	вельмі добра ++	вельмі добра ++	вельмі добра ++	задавальняюча о	добра -	вельмі добра ++
Нарэзка, шынкаваньне, праціраньне на тарцы	вельмі добра --	вельмі добра ++	вельмі добра ++	задавальняюча о	добра +	вельмі добра --	вельмі добра ++	вельмі добра ++
Зручнасьць пры карыстаньні	добра	добра						

*) Прывяло да зьніжэньня адзнакі

1) Сецевы шнур праходзіць побач з дэталямі, якія круцяцца

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Беларуская энцыкляпэдыя: У 18 т. Т.2: Аршыца — Беларусцы / Рэдкал.: Г.Пашкоў і інш. — Менск: БелЭн, 1996. — 480 с.: іл. ISBN 985-11-0061-7 (Т.2) ISBN 985-11-0035-8

Вайвадзіш Э. Вершы, паэмы, згадкі / Уклад., рэд. і камэнтар С.Панізьніка. — Менск: Нацыянальны навукова-асьветны цэнтар імя Ф.Скарыны, 1996. — 64 с. 1000 ас. — (Творцы беларускага замежжа)

Грузинский Ю. **Экономическая история Беларуси и зарубежных стран / Методические рекомендации.** — Менск: НКФ "Экоперспектива", 1996. — 104 с. 1500 ас.

З гісторыі ўніяцтва ў Беларусі (да 400-годьдзя Брэсцкай уніі) / С.Марозава, Т.Казакова, Ю.Бохан і інш. Пад рэд. М.Біча і П.Лойкі. — Менск: НКФ "Экапэрспэктыва", 1996. — 134 с. 1000 ас. ISBN 985-6102-06-5

Законодательство Республики Беларусь по налогообложению, налог на добавленную стоимость. (Закон и методические указания.) — Менск: "Право и экономика", "Вилат". — (Настольная книга бухгалтера). — 64 с. 500 ас. ISBN 985-6194-33-4

Кандрат Крапіва. Байкі / Рэдактар А.Сьляпцова. Мастак І.Дзямкоўская. — Менск: Мастацкая літаратура, 1996. — 198 с. 1500 ас.

Менская вясна 1996: Кроніка, дакумэнты, сьведчаньні / Архіў Найноўшай Гісторыі. — Podkowa Lesna — Менск: "Kolo Podkowy" — "Наша Ніва", 1996. — 141 с. ISBN 83-906215-0-9

Пасланьне канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь "Аб стане канстытуцыйнай законнасьці ў Рэспубліцы Беларусь у 1995 годзе". — На беларускай, расейскай і ангельскай мовах. — Рэдактар Г.Крукава. — Менск: 1996. — 55 с. 1000 ас.

Праўдзін В. Боль (Споведзь міліцыянэра). Аповесьць, апавяданьні. — Менск: Мастацкая літаратура, 1996. — 237 с. (Першая кніга празаіка). 500 ас. ISBN 985-02-196-7

Салтук А. Трывога лёсу: Вершы. — Менск: Мастацкая літаратура, 1996. — 126 с. 800 ас. ISBN 985-02-0295-5

Таможенные кодексы Республики Беларусь, Российской Федерации, Украины. — Менск: "Амалфея", 1996. — 432 с. ISBN 985-6015-28-6

Финансовое право. Законы Республики Беларусь по налогам, бюджету, бухгалтерскому учету и отчетности. — Менск: "Право и экономика", "Вилат". — 152 с. 1000 ас. ISBN 985-6194-30-4

Харламаў І. Пэдагогіка: Падручнік для пэд. ВНУ. — Менск: Унівэрсытэцкае, 1996. — 511 с. 5000 ас. ISBN 985-09-0026-1

Чигирь В. Кредиты и субсидии на приобретение и оплату жилья. — Менск: "Амалфея", 1996. — 128 с. 5000 ас. ISBN 985-6015-32-4

Славяне ад мора да мора



Седов В. Славяне в раннем средневековье. — Масква, 1995. —416 с.: іл. ISBN 5-87059-021-3

Аўтар працы добра вядомы аматарам старасьвеччыны. Маскоўскі археоляг В.Сядоў выпусьціў новую манаграфію па славянскай археалёгіі. Гэта працяг яго ранейшай працы "Славяне ў старажытнасьці", дзе матэрыял быў выкладзены да IV ст. Цяпер славянская гісторыя дасьледуецца аўтарам з V да XI-XII ст. Пачатковы пункт выбраны зыходзячы з археалягічных меркаваньняў — у гэты час у Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе зьявіліся бясспрэчна славянскія культуры. Гэтая дата супадае з датай, умоўна прынятай гісторыкамі пры адліку Сярэдніх вякоў — 476 г. ад Н.Х. Канцавая дата —XI-XII ст. — выбраная таму, што менавіта ў гэты час археалягічныя матэрыялы ў інфармацыйнасьці саступаюць пісьмовым крыніцам.

Археалёгію жартоўна называюць навукай аб разьбітых гаршчках. Выяваў гаршчкоў у кнізе знаходзім багата, бо гэта важны этнічны паказчык, які дазваляе аддзяліць славянскія помнікі ад, скажам, германскіх ці аварскіх. Малюнкі дапамагаюць арыенацыі ў тэксьце, бо непадрыхтаваны чытач можа заблукаць нават у простым пераліку археалягічных культур. У параўнаньні зь вядомай кнігай В.Сядова "Паходжаньне і ранняя гісторыя славян" (1979 г.) чытача цяпер чакае значна ўскладнёная карціна расьсяленьня славянскіх плямёнаў. Раней вядомым зь пісьмовых крыніцаў славянскім групоўкам VI-VII ст. — антам, склавінам, вэнэдам — В.Сядоў знаходзіў адпаведныя групы археалягічных помнікаў. У новай кнізе гэтых групаў пададзена значна больш. Гэта праска-карчацкая культура, сукаўска-дзядзіцкая група, пянькоўская культура, іпатэшты-кындзешцкая культура, серба-лужыцкая група, імянькоўская культура, крыху пазьней —валынцаўская, раменска-боршаўская, лука-райкавецкая культуры, культура пскоўскіх доўгіх курганоў, смаленска-полацкіх доўгіх курганоў, наўгародзкіх сопак.

Для кагосьці ўсе гэтыя назвы —музыка для душы, для некаторых — незразумелая тарабаршчына, але і ім будзе карысна заглянуць у кнігу — яны знойдуць грунтоўны разгляд і тлумачэньне асаблівасьцяў кожнай з гэтых культур.

В.Сядоў не спыняецца толькі на археалягічных помніках, і для складаньня поўнай карціны славянскага расьсяленьня ад Балтыйскага да Міжземнага мора зьвяртаецца да пісьмовых крыніц. Бадай толькі яны кажуць пра славянскія плямёны па ўсёй Грэцыі ў VI-VIII ст. (у кнізе маецца і адпаведная мапа), ды яшчэ пра гэта сьведчаць геаграфічныя назвы і рэдкія археалягічныя знаходкі (яны ёсьць і ў Малой Азіі на тэрыторыі сучаснай Турцыі). Аналягічнай амаль нявулоўнай групай паводле зьвестак археалёгіі былі венты ва Ўсходняй Прыбалтыцы. Пасьля сябе яны пакінулі назвы ракі Вента і горада Вентспілс ("замак вентаў") у Латвіі. В.Сядоў даказвае, што гэтыя венты — славяне (вэнэды). Прасочваецца шлях яшчэ адной славянскай міграцыі — расьсяленьне антаў (носьбітаў пянькоўскай культуры) уздоўж Дуная да Аўстрыі і Баварыі ў VI-VIII ст. Пасьля сябе яны пакінулі тапонімы, утвораныя ад назвы Русь (рака Руская Мюль, Руская Вёска ў Аўстрыі і інш.).

Цікавыя разважаньні В.Сядова аб славянскім засяленьні нашай краіны. На думку аўтара, адна плынь славян ішла з поўдня. Гэта былі носьбіты праска-карчацкай культуры, якія ў VI ст. пачалі расьсяленьне ў Палесьсі. Поўнач Беларусі засялялася славянамі больш складаным шляхам. На думку В.Сядова, ужо ў V ст. на Пскоўшчыне зьявіліся славяне, а менавіта носьбіты культуры доўгіх курганоў (будучыя крывічы). Далей на поўнач у VIII ст. зьявіліся будучыя наўгародзкія славене — носьбіты культуры сопак. Цікава, што гэтыя групоўкі знаходзіліся ў адрыве ад асноўнай масы славян. Шляхі іх расьсяленьня В.Сядоў дакладна не паказвае, але мяркуе, што яны перасяліліся зь Віслы. Такім чынам, яны выводзяцца "зь ляхаў" (летапіс "зь ляхаў" выводзіць радзімічаў і вяцічаў, што ў кнізе абвяргаецца). Да Беларусі ўсё гэта мае тое дачыненьне, што наўгародзкія славене цясьнілі на поўдзень пскоўскіх крывічоў, і ў VIII-IX ст. тыя пачалі расьсяляцца на сучасных паўночнабеларускіх і смаленскіх землях. Зьявілася культура смаленска-полацкіх доўгіх курганоў, гэта былі ўжо нашыя крывічы.

Другая частка кнігі прысьвечаная станаўленьню славянскіх дзяржаў і гістарычных народнасьцяў. Разгледжаны этнагенэз баўгараў, зьніклых альпійскіх славян, уздым і заняпад Вялікамараўскай дзяржавы, лёс панонскіх славян, якія расталі сярод вугорцаў, станаўленьне чэхаў, харватаў, сербаў, славян на Ахрыдзкім возеры (назвы "македонцы" В.Сядоў імкнецца пазьбягаць), палякаў і, нарэшце, усходнеславянская этнамоўная супольнасьць. У кнізе В.Сядова 1982 году "Усходнія славяне ў VI-XIII ст." (за якую аўтар атрымаў Дзяржаўную прэмію СССР), быў аналягічны разьдзел, але зваўся ён інакш: "Усходнеславянскія плямёны і старажытнаруская народнасьць". Ня трэба думаць, што В.Сядоў адмовіўся ад ідэі высокашанаванай "старажытнарускай народнасьці" (падмурку, у свой час, савецкага народу). Ён яе існаваньня ніколі не адмаўляў, як не адмаўляе і цяпер. Адбываецца карэкцыя тэрміну, сутнасьць зьявы застаецца.

В.Сядоў набыў вядомасьць як стваральнік канцэпцыі балцкага субстрату ў зьяўленьні беларусаў (са словаў іншых аўтараў: беларусы — гэта балты, толькі славянізаваныя). У новай кнізе чытач знойдзе выкладкі і пра балцкі субстрат, і пра адзіную старажытнарускую народнасьць. Па-праўдзе, калі Беларусь славяне пачалі засяляць з поўдня і поўначы, то ў пэўны час яны былі балцкім асяродкам у славянскім моры. Далейшыя аўтарскія сьцьверджаньні: аснову полацка-смаленскіх крывічоў склалі балцкія плямёны тушэмлянска-банцараўскай культуры, балцкі субстрат ляжыць у аснове паўднёвабеларускай гаворкі, на фармаваньне паўночнабеларускай гаворкі прыкметнае ўзьдзеяньне зрабіла субстратнае насельніцтва — дняпроўскія балты і г.д. А як са старажытнарускай народнасьцю? На думку аўтара, яна бясспрэчна існавала і мела "верхавінны" характар, бо была абумоўленая дзяржавай, царквой, горадам. Асновай усходнеславянскай супольнасьці было гарадзкое насельніцтва.

Тэорыя В.Сядова пра балцкі субстрат беларусаў сустракае моцную крытыку прыхільнікаў "брацтва" славянскіх народаў. Пры гэтым ягоная згода з існаваньнем старажытнарускай народнасьці выпадае з увагі. Як, дарэчы, і яшчэ больш радыкальная тэорыя нябожчыка члена-карэспандэнта АН СССР П.Трацьцякова. Той меркаваў, што старажытнаруская народнасьць цапкам узьнікла на балцкім субстраце...

Новая праца В.Сядова адметная некаторымі асаблівасьцямі. Сапраўды энцыклапэдычная праца зьявілася не ў дзяржаўным выдавецтве і занадта малым накладам. Тысяча асобнікаў на славянскамоўны (і ня толькі) сьвет — гэта нішто. Можна толькі пазайздросьціць аўтару, які ў 70 гадоў набыў кампутар, навучыўся зь ім працаваць і цяпер кожны год дорыць чытачам кнігу. Нам застаецца пасьпяваць чытаць.

Валеры Пазьнякоў

Кніга — поштай

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць кнігі:



1. **Адам Глёбус. Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы.** – Менск: Сучасная літаратура, 1995. – 310 с. 40.000 БРБ
2. **Адам Глёбус. Скрыжаваньне.** – Менск: БАДППР – "Ковчег", 1993. – 46 с. 7.000 БРБ
3. **Юліяна Вітан-Дубейкаўская. Мае ўспаміны.** – Вільня, 1994. – 192 с. 24.000 БРБ
4. **Баляслаў Лесьмян. Пан Бліштвінскі** / Пераклад з польскай. – Вільня-Менск: "Наша Ніва" – "Мастацкая Літаратура", 1994. – 93 с. 10.000 БРБ
5. **Вітаўт Кіпель. Беларусы ў ЗША.** – Менск, 1993. – 352 с. 25.000 БРБ
6. **Брэтон Ф., Пру С. Выбух камунікацыі.** – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1995. – 336 с. 24.000 БРБ
7. **Говард Майкал. Сучасная культурная антрапалёгія.** – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1996. – 486 с. 35.000 БРБ
8. **Лоўзі Дж. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі.** – Менск: БФС – "Тэхналёгія", 1995. – 328 с. 24.000 БРБ
9. **Энтані Сьміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі.** – Менск: БФС – "Эўрафорум", 1995. – 272 с. 20.000 БРБ
10. **Джын Эйчысан. Гаваркія істоты: Уводзіны ў псыхалінгвістыку.** – Менск: БФС – "Кліч", 1995. – 312 с. 20.000 БРБ
11. **Браян М. Фэйган. Уводзіны ў археалёгію.** – Менск: БФС, 1996. – 272 с. 24.000 БРБ
12. **Беларускі рок-н-рол: Тэксты ("Бонда", "Крама", "Мроя", "Новае Неба", "Уліс").** – Менск: "Ковчег", 1994. – 64 с. 7.000 БРБ
13. **Беларускі вайсковы строй і зброя XII-XVIII ст.** Камплект каляровых паштовак (12 асобнікаў). – Менск: НВФ "Vaukalaka", 1996. 25.000 БРБ
14. **Беларускі гістарычны агляд.** 1996, т. 3, сшытак 1. 35.000 БРБ
15. **Ш.Дэбаш, Ж.-М.Пант'е. Уводзіны ў палітыку.** – Менск: БФС – "Эўрафорум", 1996. – 624 с. 40 000 БРБ
16. **М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі (1765-1794).** – Менск, 1994. – 168 с., каляровыя іл. 20 000 БРБ
17. **Z.Fedecki. Цёплыя вечары... ды халодныя ранкі, czyli co śpiewano w Feliksowie.** – Warszawa, 1992. – 160 с. 20 000 БРБ
18. **Юрг Штайнэр. Эўрапейскія дэмакратыі.** — Менск: БФС — "Лекцыя", 1996. — 343 с. 45.000 БРБ.
19. **Джон Бэрдшоў. Эканоміка. Ч. 1: Мікраэканоміка / Дапаможнік для студэнтаў.** — Менск: БФС — "Тэхналёгія", 1996. — 560 с. 50.000 БРБ.
20. **Ўастан Ла Бар. Асабістасьць з псыхааналітычнага пункту гледжаньня.** — Менск: "Тэхналёгія", 1995. — 47 с. 15.000 БРБ.
21. **Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры). №1, 1996.** 35 000 БРБ.

Зьвяртайцеся на адрас: Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89. У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз тэл. 239-78-49.

Кніга — поштай

Рэдакцыя часопіса "Калосьсе"

прапануе наступныя выданьні:

1. **Калосьсе, №1-1993.** — 60 с. 10.000 БРБ
2. **Калосьсе №2-3-1995.** — 144 с. 25.000 БРБ
3. **Вінцэсь Мудроў. Жанчыны ля басэйна.** — Менск: Мастацкая літаратура, 1992. — 160 с. 15.000 БРБ
4. **Юры Гумянюк. Твар Тутанхамона.** — Полацак: Полацкае ляда, 1994. — 52 с. 10.000 БРБ
5. **Алесь Аркуш. Разьтаньне з Танталам.** — Полацак: Полацкае ляда, 1994. — 54 с. 10.000 БРБ
6. **Ігар Сідарук. Саната Арганата.** — Полацак: Полацкае ляда, 1994. — 64 с. 10.000 БРБ
7. **Лявон Вольскі. Калідор.** — Полацак: Полацкае ляда, 1993. —38 с. 10.000 БРБ
8. **Ксэракс беларускі №6.** — Полацак, 1996. — 48 с. 10.000 БРБ

Каб атрымаць патрэбную Вам кнігу, пералічыце названую суму грошай на адрас: Алесь Козік, Наваполацак-11, п/с 36. Не забудзьце падаць свой адрас.

УВАГА!



Восеньскі распродаж

З *45.000* да *35.000* (плюс 5000 руб. на паштовыя выдаткі) зьніжаныя кошты на апошнія 100 асобнікаў кніжкі Адама Глёбуса "**Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы**". Гэта першая кніжка з сэрыі *"Сучасная літаратура"*, і яна цікавая менавіта сучаснаму чалавеку.

НОВЫ БЕЛАРУСКІ КНІЖНЫ ПРАЕКТ

Беларускі Гуманітарны Фонд "Наша Ніва" наладзіў распаўсюджаньне найноўшых беларускіх выданьняў у галіне гуманістыкі, а таксама мастацкае літаратуры. Наша мэта — зрабіць новую беларускую кнігу жывым фактарам сучаснае культуры.

Сыстэма "Новага беларускага кніжнага праекту" дзейнічае ў гарадах:

БЕРАСЬЦЕ

Кнігі Браяна М. Фэйгана "Ўводзіны ў археалёгію", Энтані Сьміта "Нацыяналізм у XX ст.", Ш.Дэбаша й Ж.-М.Пант'е "Ўводзіны ў палітыку" можна набыць у кнігарнях "СЬВІТАНАК" (бульвар Касманаўтаў, 120) і "АСЬВЕТА" (вул. Маскоўская, 57). У "Сьвітанку" таксама прадаецца камплект каляровых паштовак "Беларускі вайсковы строй і зброя XII-XVIII ст."

ГОМЕЛЬ

У памяшканьні Гомельскай абласной унівэрсальнай бібліятэкі (пл. Перамогі, 2) пры Аддзеле інфармацыйных тэхналёгіяў (тэл. 55-71-97) адкрыты кніжны аддзел. Гэта адзіная кропка ў 500-тысячным горадзе, дзе можна пабачыць такі асартымэнт сучасных беларускіх кніг — мастацкую літаратуру, дасьледаваньні ў галіне гуманістыкі, найноўшыя пераклады. Апроч кніжак тут таксама можна прыдбаць самыя апошнія запісы беларускае музыкі.

ГОРАДНЯ

Продаж кніжнай прадукцыі адбываецца ў шапіку "ВАСІЛЁК" (насупраць Унівэрсытэту).

МАЛАДЭЧНА

Кнігі можна набыць у шапіку ТБМ (на чыгуначным вакзале).Па даведкі можна зьвяртацца праз тэл. 6-71-70 да Алеся.

МЕНСК

Кніга Браяна М. Фэйгана "Ўводзіны ў археалёгію" прадаецца ў кнігарнях "Сьветач", "Акадэмкніга", "Кнігарня пісьменьніка", "Палітkніга". Кнігі Адама Глёбуса "Толькі не гавары маёй маме... Зборнік інтымнае прозы" і "Дамавікамэрон" прадаюцца ў крамах "Сьветач" і "Кнігарня пісьменьніка", у шапіку ў фае Нацыянальнай бібліятэкі.

СЬВЕТЛАГОРСК

Кнігі можна набыць у філіі БГАКЦ, Зялёная вул., дом 10, паверх 2. Тэл. (8-02342) 2-71-77.

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт — 25.000 БРБ):



1. **НОВАЕ НЕБА.** Сон у трамваі.
2. **НОВАЕ НЕБА.** Go home (1995).
3. **НОВАЕ НЕБА.** Дзеці чорнага гораду (1991).
4. **КРАМА.** Камэндант (1995).
5. **КРАМА.** Хворы на Rock-n-Roll.
6. **КРАМА.** Гэй, там, налівай! (1994).
7. **N.R.M.** LaLaLaLa (1995).
8. **ULIS.** Life (1996).
9. **УЛІС.** Чужаніца (1991).
10. **УЛІС.** Краіна доўгай белай хмары (1990).
11. **БОНДА.** Найлепшыя песьні.
12. **МЯСЦОВЫ ЧАС.** Наша ўскраіна (1991).
13. **ПАЛАЦ.** Палац (1996).
14. **Песьні беларускіх бардаў** (1992).
15. **РЭНЭСАНС** (беларускі джаз).
16. **БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ.**
17. **БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА** (1-3)
18. **БЕЛАРУСКАЯ ГІТАРНАЯ МУЗЫКА.**
19. **ЗАЛАТЫ ФОНД БЕЛАРУСКАГА РОК-Н-РОЛУ** (1-3).

Т.1: Бонда. Уліс. Мроя. Рэй. Мясцовы Час. Блізьняты.
Т.2: Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае Неба. Мясцовы Час. Тутэйшыя хлопцы.
Т.3: Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & "Доктор Моро". Гранит. Метро. Сузор'е. Зарни с.
Т.4: Палац. Уліс. Крама. Новае Неба. Мроя.
Т.5: Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Red Dynamite. Флэт.

20. **МРОЯ.** Найлепшыя песьні з праграмаў 1987-90 г.
21. **УЛІС.** Блуканьне (1996).
22. **ВІКТАР ШАЛКЕВІЧ.** Смутны беларускі блюз (1996).
23. **КАМЭЛОТ.** У краіне талераў (1995).
24. **ZINDAN** (1994).
25. **КРАМА.** The Best (1996).

Зьвяртайцеся на адрас: 220094 Менск, а/с 89, Андрыеўскаму Андрэю Паўлавічу. У Менску да А.Андрыеўскага можна зьвярнуцца праз тэл. 239-78-49.

РАРЫТЭТ

Паведамленьне для аматараў «Нашай Нівы»

У рэдакцыі "Нашай Нівы" вы можаце замовіць рарытэтныя нумары з моманту аднаўленьня газэты ў Вільні: №1-4 за 1991 г., №6-8 за 1992 г., №10, 12-18 за 1993 г., №1, 2, 6, 8-9, 12 за 1994 г., №5-8 за 1995 г.

Ахвотныя могуць замовіць сабе ксэракопію любога нумару.

Зьвяртайцеся на адрас:

Андрыеўскі Андрэй Паўлавіч, Менск 220094, а/с 89.

Паведамленьне для замоўцаў Літоўскае Мэтрыкі.

У Менск завезены шосты й восьмы тамы Мэтрыкі. Просьба да тых, хто не пакідаў пры замове нумароў сваіх тэлефонаў, зьвярнуцца да Андрэя Андрыеўскага праз тэлефон **239-78-49**.


14.10 - 20.10 1996 Інфарматар N28

Дзе сябе намаляваць?

ТЭСТ

Прапануем вам жартаўлівы тэст. Вакол стала ў два разы болей крэслаў, чым членаў сям'і (мал.8). Прапануйце дзіцяці пазначыць крыжыкам ці намаляваць сябе на абраным ім месцы. Не перашкаджайце яму парадамі, хай падумае. Гатова?

Самыя лепшыя адносіны ў дзіцяці з тым з членаў сям'і, побач зь якім ён сябе намаляваў. Гэты чалавек аказвае на яго найбольшы ўплыў. Калі дзіця выбрала месца паміж бабуляй і дзядулем, то іх можна павіншаваць. Калі дзіця намалявала сябе асобна, то... ці так яму ўжо добра ў сям'і?



Новая рубрыка

АДКАЗВАЕМ НА ПЫТАНЬНІ ЧЫТАЧА

Шылкін Алег, студэнт, Баранавічы

Вы неяк друкавалі ў "Інфарматары" пра прыродныя атруты, як слушна харчавацца і выбіраць прадукты на рынку і інш. Зараз шмат гавораць пра разнастайнасьць рацыёну (А дзе яго ўзяць?), пра большае ужываньне сырой гародніны і садавіны. У мяне сям'я, жонка і маленькая дачка, як фармаваць свой рацыён, ад чаго можна адмовіцца (з-за недахопу грошай) бяз шкоды для здароўя?



Алег, не зьмяняйце звыклы склад ежы і сутачны расклад ейнага прыёму без асаблівай неабходнасьці, бо абарончыя сыстэмы арганізму найбольш прыстасаваныя да звыклага рэжыму працы.

Не захапляйцеся ўжываньнем сырой гародніны і садавіны: бо пракантраляваць зьмесьціва ў іх натуральных атрутаў і антынутрыентаў вельмі складана. Цеплавая апрацоўка, квашэньне, саленьне, як правіла, робяць іх больш бясьпечнымі.

Харчовая каштоўнасьць бабовых пасьля цеплавой апрацоўкі ўзрастае — за кошт вызваленьня дадатковай колькасьці засваяльных кіслотаў.

Не давайце дзецям у вялікай колькасьці гарбату, каву, какао. Гэтыя напоі могуць замарудзіць іхні рост.

Харчовыя валокны, якія маюцца ў прадуктах у аптымальных колькасьцях, садзейнічаюць страваваньню, але іхні лішак можа прывесьці да страты арганізмам мінэральных соляў.

Але Вы закранулі вельмі аб'ёмную тэму і мы прысьвецім ёй асобную старонку "Інфарматара" ў адным з наступных нумароў у рубрыцы "Школа выжываньня".

М.Сямёнаў, камэрсант. Менск:

Я жадаў набыць у краме дарагую статуэтку, але калі прадавец перадаваў яе мне для агляду, яна ўпала і разбілася. Скажыце, ці магу я заплаціць толькі палову кошту гэтай статуэткі?

Адказваем спадару Сямёнаву:

У дадзеным выпадку вы можаце ўвогуле не аплочваць разбітую статуэтку, таму што рызыка выпадковай гібелі рэчы ляжыць на ейным уладальніку. Калі вы яшчэ не аплацілі тавар, то за яго адказвае прадавец, а калі грошы за тавар былі атрыманыя ім, то рызыка гібелі ляжыць на вас.

Менавіта таму, пакуль вы не прайшлі праз касу ў зале крамы, які працуе паводле мэтаду самаабслугоўваньня, за выпадкова разьбіты слоік з кампотам вы не адказваеце. Раней існаваў нават "працэнт за страту тавара": у крамах самаабслугоўваньня з матэрыяльна-адказных асобаў сьпісваласе 0,2% з абароту тавара.

Сіротка Мікалай, рабочы. Менск.

Ці праўда, што ў музычных цэнтрах гучаньне лепшае чым у магнітолы?

Сапраўды, гучаньне ў музычных цэнтрах увогуле лепшае, чым у стэрэамагнітолаў, але яны таксама і каштуюць даражэй. Найлепшыя мадэлі сярод кампактных установак, Panasonic SC-CH 11 і Grundig Mini каштуюць каля 900 і 1100 ням. марак.

Той, хто гатовы адмовіцца ад прайгравальніка кампактных дыскаў у радыёмагнітоле, можа сэканоміць мінімум 100 марак.

Бычок Алесь, Пружаны.

У чым заключаецца прынцып відэа?

Відэазапіс заснаваны на прынцыпу пераўтварэньня сьвятла ў электрычныя імпульсы, которыя запісваюцца потым на магнітную стужку. Гук, які суправаджае кадар, запісваецца адначасова праз мікрафон на відэакасэту. Пры ўзнаўленьні працэс ідзе практычна ў адваротнай пасьлядоўнасьці. Інфармацыя, запісаная на магнітную відэастужку, "чытаецца" так званымі відзагалоўкамі і пераўтвараецца ў электрычныя імпульсы, каб потым стаць бачнай на экране. У адрозьненьне ад кінакамэраў, кадры, зьнятыя пры дапамозе відэакамэры, можна ўзнаўляць адразу ж пасьля здымак. Для гэтага відэакамэру можна падключыць да любога сучаснага тэлевізара. Для больш старых мадэляў тэлевізараў, у каторых няма яшчэ аўдыё-відэа-гнязда падключэньня, неабходна ўжыць так званы высокачастотны мадулятар. Гэтыя прыстаўкі не ўваходзяць у камплект відэакамэры, але іх можна дадаткова купіць за 100-150 марак.

Пятроўская Тацьцяна, бухгальтар, Менск.

Скажыце чым можна выдаліць пляму крыві на ваўнянай тканіне?

Тацьцяна, смачыце пляму цёплай вадой, распусьціўшы ў ёй таблетку асьпірыну, затым прасушыце тканіну фэнам.






Галіна Р. Менск

Нядаўна на "Дынама" я купіла панчохі "Body by Hollywood", але зьдзівілася: пераканаваньні прадаўца, у якога я іх набыла, што гэта сапраўдныя панчохі з Lycra, не адпавядаюць рэчаіснасьці. Гэтыя панчохі слаба расьцягваюцца і ня маюць бліскучага эфэкту, які характэрны для такіх панчохаў.

Панчохі бяз лайкры



На здымку: *ліцавы бок каробачкі з панчохамі-падробкай.*

Для кожнай жанчыны панчохі — гэта не прадмет раскошы, а першая неабходнасьць. Таму вельмі істотна, як доўга яны носяцца. Асаблівую трываласьць панчохам надае валакно лайкры.

У продажы зьявіліся разнастайныя ўзоры панчохаў, і ў прыватнасьці панчохі "Body by Hollywood", на каробачцы якіх значыцца гандлёвая марка "Lycra Sensations".

Вядомая фірма DU PONT (стваральнік і адзіны ў сьвеце вытворца высакаякаснага элястычнага валакна Lycra (лайкра)) была непрыемна зьдзіўленая, выявіўшы на нізкаякасных панчохах сваю маркіроўку, да таго ж груба падробленую. Заключэньне тэхнічнага прадстаўніка фірмы было лякалічным і адназначным: "У прадстаўленым узоры жаночых панчохаў "Body by Hollywood" няма валакна Lycra ў пагаленцы і торсе панчохаў. Дадзены выраб не адпавядае існуючым стандартам якасьці і незаконна мае гандлёвую маркіроўку "Lycra Sensations".

Прадстаўнікі фірмы далі некалькі парадаў наконт таго, як пакупнікам адрозьніваць панчохі з лайкрай.

Панчохі з лайкрай пры расьцягваньні (папярочным, вэртыкальным) могуць павялічвацца да 7 разоў у аб'ёме, прымаючы ранейшую форму пры аслабленьні нацягненьня.

На каробачцы ці цэтліку, прымацаванаму да панчохаў, павінна ўказвацца працэнтная колькасьць лайкры ў пагаленцы і торсе, а таксама гандлёвая маркіроўка фірмы DU PONT.

Панчохі з лайкрай, улічваючы іх высокія спажывецкія якасьці, не каштуюць танна.

Праўдзейны член Геаграфічнага таварыства і чытач "НН" Міхась Маліноўскі прапануе усім, хто жадае прыняць удзел у вызначэньні: - сямі цудаў сьвету Беларусі; - сямі найвялікшых і найвыдатнейшых збудаваньняў дойлідства Беларусі; - сямі найпрыгажэйшых гарадоў Беларусі; - сямі найпрыгажэйшых культавых збудаваньняў; -сямі мястэчак Беларусі; - сямі вёсак Беларусі; - сямі найвыдатнейшых падзей; - сямі славутых гістарычных асобаў Беларусі; - сямі найвыдатнейшых датаў краіны; - сямі найвялікшых пісьменьнікаў (вучоных, мастакоў, юрыстаў, гісторыкаў, падарожнікаў і г.д.)

Калі ў Вас зьявілася цікавасьць зрабіць такія вызначэньні разам зь Міхасём Маліноўскім, дасылайце свае меркаваньні да спадара Маліноўскага на адрэсу:

225320 г. Баранавічы, вул. Брэсцкая, дом 293/2, кв.42
Маліноўскаму Міхасю Міхайлавічу

Архівы КГБ

10 гадоў бяз права перапіскі...

Праўда пра сталінскія рэпрэсіі дагэтуль хаваецца за сямю замкамі

Камітэт Дзяржаўнай Бясьпекі
пры Савеце Міністраў СССР
26 сьнежня 1962 г.
№3265-с

Зусім сакрэтна
2-гі сэктар
ЦК КПСС

У 1955 годзе зь ведама інстанцыяў і пры згодзе Пракуратуры СССР Камітэт дзяржбясьпекі выдаў указаньне №108зс органам КГБ, якое вызначае парадак разгляду заяваў грамадзянаў, што цікавяцца лёсам асобаў, растраляных паводле рашэньня несудовых органаў (б. Калегіяй ОГПУ, тройкамі ПП ОГПУ-НКВД-УНКВД і Камісіяй НКВД СССР і Пракурора СССР). У адпаведнасьці з гэтымі ўказаньнямі органы дзяржбясьпекі паведамляюць членам сем'яў асуджаных, што іх сваякі былі асуджаныя на 10 гадоў ИТЛ і памерлі ў месцах пазбаўленьня волі, а ў неабходных выпадках пры вырашэньні маёмасных ці іншых прававых пытаньняў рэгіструюць ў загсах сьмерць расстраляных з выдачай заяўляльнікам пасьведчаньняў, у якіх даты сьмерці датуюцца ў межах 10 гадоў з дня арышту, а прычыны сьмерці — выдуманыя.

Устанаўленьне ў 1955 годзе ўказанага парадку матывавалася тым, што ў пэрыяд масавых рэпрэсіяў была неабгрунтавана асуджана вялікая колькасьць асобаў, таму паведамленьне пра сапраўдны лёс рэпрэсаваных магло адмоўна паўплываць на становішча іх сем'яў. Акрамя таго, меркавалася, што паведамленьне членам сем'яў расстраляных сапраўднага лёсу іх сваякоў магло быць выкарыстана ў той час асобнымі варожымі элемэнтамі на шкоду інтарэсам савецкай дзяржавы.

Існуючы парадак паведамленьня выдуманых зьвестак датычыцца ў асноўным бязьвінна пацярпелых савецкіх грамадзянаў, якія былі расстраляныя паводле рашэньня несудовых органаў у пэрыяд масавых рэпрэсіяў.

У выніку перагляду крымінальных справаў з 1954 да 1961 году з агульнай колькасьці расстраляных у несудовым парадку каля паловы рэабілітаваныя. У адносінах да большасьці зь іх сваякам былі аб'яўленыя зьвесткі аб сьмерці, якая быццам бы надыйшла ў месцах пазбаўленьня волі, што не адпавядае рэчаіснасьці.

Пасьля праведзенай Цэнтральным Камітэтам КПСС працы па выяўленьні беззаконнасьці, дапушчанай у пэрыяд культу асобы Сталіна, існуючы парадак разгляду заяваў грамадзянаў з запытамі пра лёс іх сваякоў лічым неабходным адмяніць.

Паведамленьне грамадзянам выдуманых датаў і абставінаў сьмерці блізкіх ім асобаў ставіць органы бясьпекі ў ілжывае становішча, асабліва пры публікацыі ў друку датаў сьмерці асобаў, якія мелі ў мінулым заслугі перад партыяй і дзяржавай. Акрамя таго, рэгістрацыя сьмерці расстраляных асобаў паводле рашэньня несудовых органаў з указаньнем у дакумэнтах выдуманых тэрмінаў іх знаходжаньня ў месцах пазбаўленьня волі ставіць членаў іх сем'яў у няроўныя ўмовы з членамі сем'яў асобаў, расстраляных паводле рашэньня суда.

Савецкія людзі пра масавыя парушэньні сацыялістычнай законнасьці ведаюць, і матывы, з-за якіх у 1955 годзе быў устаноўлены парадак паведамленьня сваякам пра лёс рэпрэсаваных членаў іх сем'яў, адпалі.

Улічваючы пераказанае, уяўляецца мэтазгодным надалей на запыты грамадзянаў пра лёс іх сваякоў, асуджаных у несудовым парадку да расстрэлу, вусна паведамляць сапраўдныя абставіны сьмерці гэтых асобаў, а рэгістрацыю ў загсе іх сьмерці натаваць датай расстрэлу, без указаньня прычыны сьмерці, як гэта робіць Вайсковая калегія Вярхоўнага суда СССР і вайсковыя трыбуналы ў адносінах да асобаў, расстраляных паводле прысудаў судоў.

Пры гэтым маецца на ўвазе, што дадзены парадак ня будзе распаўсюджвацца на асобаў, у адносінах да якіх адказы даваліся ў адпаведнасьці з раней устаноўленымі і дзейнымі ў цяперашні час парадкамі разгляду заяваў.

Паведамленьне грамадзянам пра сапраўдную прычыну сьмерці асуджаных асобаў будзе даваць членам іх сем'яў, якія маюць права на пэнсійнае забесьпячэньне ў выпадку страты кармільца, падставу ўзбуджаць хадайніцтвы перад адпаведнымі органамі пэнсіяў на ільготных умовах як сваякам асобаў, якія памерлі ад працоўнага калецтва альбо загінулі пры выкананьні службовых абавязкаў.

Трэба адзначыць, што колькасьць заяваў пра лёс асуджаных у несудовым парадку з кожным годам скарачаецца (у 1955 годзе 36.225, а за 8 месяцаў 1962 году 8.018).

Устаноўлены рашэньнем Прэзыдыюма Савета Міністраў СССР ад 15 сьнежня 1959 года (пратакол №37) парадак паведамленьня за мяжу датаў сьмерці асуджаных да расстрэлу ў дачыненьні да абставінаў кожнай справы, але не раней за даты прывядзеньня прысуду да выкананьня і не пазьней за 10 гадоў з дню арышту, на нашу думку, мэтазгодна не зьмяняць.

Дадзеная прапанова ўзгоднена з Пракуратурай СССР і Вярхоўным судом СССР.

Прашу разгледзець.

Старшыня Камітэта Бясьпекі В.Семічасны

Працяг са старонкі 1.

сьмерці вызначалася КГБ адвольна ў межах 10 гадоў з дня арышту, выдуманая была і прычына сьмерці, а ў якасьці яе месца ўказвалася месца жыхарства асуджанага да арышту.

Што тычыцца расстраляных паводле прысудаў Вайсковай калегіі Вярхоўнага суда СССР, дык тут указаньні ЗАГСам павінны былі даваць ня органы КГБ, а сама Вайсковая калегія. Паводле дзейнага ў тыя гады ў Вайсковай калегіі парадку сваякам асуджаных да вышэйшай меры пакараньня паведамлялася не пра расстрэл, а пра выдуманую дату сьмерці іх родных і блізкіх.

Работнікі савецкіх і партыйных органаў, разьбіраючы заявы сваякоў асуджных да вышэйшай меры, паведамлялі ім пра расстрэл. А Вайсковая калегія настойвала на тым, што асуджаныя памерлі ў месцах пазбаўленьня волі.

Органы НКВД-МГБ-КГБ паведамлялі сваякам асуджаных да расстрэлу, што апошнія быццам бы асуджаныя на 10 гадоў пазбаўленьня волі ў аддаленых месцах Крайняй Поўначы бяз права перапіскі. Вайсковая калегія на гэтай аснове давала выдуманую дату сьмерці. Паміж днём суда і гэтай датай утвараўся разрыў у 5-6 гадоў.

Нягледзячы на тое, што ў Вайсковую калегію ў пэрыяд 1953-1959 гадоў рэзка павялічвалася колькасьць зваротаў грамадзкіх арганізацый, установаў і асобаў са сьпісамі грамадзянаў, якія мелі ў мінулым вялікія заслугі перад дзяржавай, з просьбай паведаміць, ці рэабілітаваныя яны і які іхні лёс, калегія працягвала паведамляць «ліпавыя» даты сьмерці. У выніку выдуманыя даты сталі зьяўляцца ў афіцыйных дакумэнтах і пасьведчаньнях аб сьмерці. Органы ЗАГС паводле ўказаньня КГБ працягвалі выдаваць ілжывыя пасьведчаньні аб сьмерці. Такія «дакумэнты» атрымалі сотні тысячаў грамадзянаў.

Зацьверджаньне ў 1955 годзе ўказанага «парадку» матывавалася тым, што падчас масавых рэпрэсіяў была неабгрунтавана асуджана вялікая колькасьць грамядзянаў і таму паведамленьне пра сапраўдны лёс рэпрэсаваных нібыта «магло адмоўна ўзьдзейнічаць на становішча іх сем'яў». Акрамя таго, лічылася, што паведамленьне членам сем'яў расстраляных пра сапраўдны лёс іх сваякоў нібыта магло быць «выкарыстана варожымі элемэнтамі на шкоду інтарэсам савецкай дзяржавы». У выніку перагляду архіўна-сьледчых справаў з 1954 да 1961 году з агульнай колькасьці расстраляных у несудовым парадку было рэабілітавана каля 60 працэнтаў асуджаных. Сваякам пра іх былі паведамленыя ілжывыя зьвесткі пра сьмерць, якая быццам надыйшла ў месцах пазбаўленьня волі. І толькі ў сьнежні 1962 году ў нэтрах КГБ высьпела прапанова пра адмену такога «парадку». Але гэта было выклікана зусім не гуманнымі меркаваньнямі. Аказваецца, паведамленьне выдуманых датаў і абставінаў сьмерці ставіла органы дзяржбясьпекі ў «нязручны стан», асабліва пры публікацыі ў друку датаў сьмерці асобаў, якія мелі заслугі перад партыяй і дзяржавай. Такую прапанову ўнес старшыня КГБ СССР В.Семічасны (гл. дакумэнт).

Новая хлусьня ўзору 1963 году праіснавала да канца 80-х і была скасаваная ў 1989 годзе. Такім чынам, людзі, якія атрымалі адказ паміж 1955 і 1963 гадамі і якія не зьвярталіся з новымі запытамі пасьля 1989 году, так і засталіся недасьведчаныя пра сапраўдныя прычыны і даты гібелі сваіх родных. У колькіх беларускіх сем'ях захоўваюцца «ліпавыя» пасьведчаньні аб сьмерці? На гэта пытаньне, напэўна, не адкажуць нават супрацоўнікі КГБ, паводле ўказаньня якога яны выдаваліся. Зьвернемся да канкрэтнага прыкладу.

Паповіч Станіслаў Паўлавіч нарадзіўся ў красавіку 1892 году ў Магілёўскай губэрні. У 1910 годзе падчас сталыпінскай рэформы разам з бацькамі пераехаў на новае месца жыхарства ў вёску Зоркальцава Заходне-Сібірскага краю. У 30-я гады працаваў электраманторам у Томскім інстытуце бактэрыялёгіі. У 1937-м быў арыштаваны органамі НКВД як «удзельнік контррэвалюцыйнай падпольнай арганізацыі «Польская арганізацыя вайсковая». Далейшы ягоны лёс доўгія гады быў невядомы. Пасьля вайны ягоны сын Нінел Станіслававіч неаднаразова зьвяртаўся ў пракуратуру і МГБ з просьбай паведаміць інфармацыю пра бацьку.

Усе спробы што-небудзь дазнацца ні да чаго не прывялі. Толькі ў 1947 годзе сям'я атрымала «пасьведчаньне» аб сьмерці, у якім было пазначана, што іх бацька і муж памёр 3 кастрычніка 1941 году ад «упадку сардэчнай дзейнасьці». І толькі праз 42 гады Нінел Станіслававіч даведаўся пра сапраўдную прычыну сьмерці бацькі. Але месца пахаваньня яго невядомае да цяперашняга часу...

Архівы КГБ пэрыяду масавых рэпрэсіяў да цяперашняга часу захоўваюцца пад грыфам «сакрэтна». Ці будуць адчыненыя для спэцыялістаў справы былых супрацоўнікаў НКВД? Якія архіўныя матэрыялы ўжо зьнішчаныя? Паводле чыйго загаду? Адказаць на гэтыя і шмат іншых пытаньняў дазволіў бы больш адкрыты доступ дасьледчыкаў у ведамасныя архівы і перш за ўсё КГБ.

Што ж уяўляюць сабою архівы КГБ? (Размова пойдзе пра структуру архіваў дзяржбясьпекі на момант распаду СССР.) Існуюць два ўзроўні: цэнтральны архіў і архівы абласных управаў. (Усе гарадзкія і раённыя аддзелы КГБ здаюць свае матэрыялы ў адпаведныя абласныя ўправы.) Якія асноўныя тыпы дакумэнтаў, што датычацца непасрэдна праблем рэпрэсіяў і рэабілітацыяў, сканцэнтраваныя ў архівах КГБ і якія неабходна раскрыць для аднаўленьня гістарычнай праўды.

1) МАТЭРЫЯЛЫ САКРЭТНАГА СПРАВАВОДЗТВА. Гэта інфармацыйныя і дакладныя запіскі ў органы ўлады і кіраваньня СССР і БССР, пляны, справаздачы, і іншыя абагульняльныя дакумэнты па выведчай і контрвыведчай працы і адміністратыўнай дзейнасьці. Некаторыя зь іх маюць сталы, а некаторыя — часовы статут захаваньня.

2) АРХІЎНА-СЬЛЕДЧЫЯ СПРАВЫ на грамадзянаў, якія падпалі пад рэпрэсіі ў пэрыяд з 1918 да 1991 году, а таксама на так званых «памагатых» часоў вайны, шпіёнаў, супрацоўнікаў НКВД-КГБ, асуджаных за фальсыфікацыю сьледчых справаў, карнікаў часоў вайны, г.зн. увесь комплекс сьледчых справаў, якія былі падведамасныя КГБ.

3) КОПІІ ПРАТАКОЛАЎ паседжаньняў несудовых органаў ВЧК-ОГПУ-НКВД-МГБ (Асобая нарада пры НКВД СССР, Камісія НКВД і Пракурора СССР — «двойка», Асобая тройка НКВД БССР).

4) ФІЛЬТРАЦЫЙНЫЯ І ТРАФЭЙНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ. Усе савецкія грамадзяне, якія былі на акупаванай тэрыторыі, у лягерах для ваеннапалонных ці вывозіліся на працу ў Нямеччыну, пры вяртаньні ў СССР праходзілі праверку ў праверачна-фільтрацыйных лягерах. На іх заводзіліся анкеты, да гэтых анкетаў дадаваліся дадатковыя матэрыялы, — так утвараліся праверачна-фільтрацыйныя справы.

5) АСАБІСТЫЯ СПРАВЫ БЫЛЫХ СУПРАЦОЎНІКАЎ ДЗЯРЖБЯСЬПЕКІ. Маюць неабмежаваны тэрмін захаваньня.

6) АСАБІСТЫЯ СПРАВЫ АГЕНТАЎ (штатных і пазаштатных) і апэратыўныя справы. Тут усе віды справаў апэратыўнага ўліку, кантролю, праверкі, назіраньня, апэратыўнай распрацоўкі, аб'ектыўнай распрацоўкі.

Без дэтальнага вывучэньня гэтых дакумэнтаў атрымаць аб'ектыўную карціну рэпрэсіяў пэрыяду 20-50-х гадоў немагчыма.

У зьвязку з тым, што многія ня ведаюць пра лёсы сваіх родных, рэпрэсаваных у пэрыяд 20-50-х гадоў, неабходна мець уяўленьне аб захаваньні ў архівах дзяржбясьпекі архіўна-сьледчых справаў.

Гэты парадак быў зацьверджаны старшынём КГБ СССР яшчэ 18 лістапада 1961 году. Згодна зь ім, у архівах КГБ захоўваюцца ўсе справы на асуджаных па палітычных матывах. У тэрытарыяльных органах дзяржбясьпекі захоўваюцца архіўна-сьледчыя справы, па якіх гэтыя органы вялі папярэдняе сьледзтва, а таксама крымінальныя і грамадзянскія справы, якія ўтрымліваюць «сакрэтныя» зьвесткі. Акрамя таго, захоўваюцца пратаколы паседжаньняў Асобай тройкі НКВД БССР на асуджаных па палітычных матывах.

Архіўна-сьледчыя справы на вайскоўцаў і супрацоўнікаў транспарту раней здаваліся на захаваньне ў тэрытарыяльныя органы КГБ ў месцы дыслякацыі штабу Беларускай вайсковай акругі. Цяпер яны знаходзяцца на захаваньні ў органах дзяржбясьпекі ў месцы нараджэньня вайскоўцаў, а справы цывільных асобаў, якія прыцягваліся да адказнасьці — у месцы жыхарства. Групавыя справы захоўваюцца ў тэрытарыяльных органах дзяржбясьпекі ў месцы жыхарства (на вайскоўцаў — у месцы нараджэньня) аднаго з асноўных удзельнікаў групы.

Ці можам мы разьлічваць, што ў бліжэйшы час пабачым праўдзівае адлюстраваньне гісторыі краіны? Няхай на гэтае пытаньне самастойна адкажа кожны — сам сабе. І той, хто лічыць тэму масавых рэпрэсіяў вычарпанай, і той, каго яна турбуе і сёньня.

Ігар Кузьняцоў



Сяржук Сокалаў

ПАДОНКІ

Апавяданьне

Вёска нашая нават у старажытных паперах называлася проста –Падонкі... У суседніх Вярхоўцах ажно да цяпер верхаводную рыбу вудзяць, а мы з пакон век – толькі донную. Хто ж гэтага ня ведае? Бывала, яшчэ за маёй памяцяй, дзядзькі за грудкі схопяцца, цёткі ў сварку, ды сучкі з двароў у лаянку, а дзеці ў сьлёзы... Потым сунімуцца. Дзядзькі па чарцы, цёткі па прыпеўцы, сучкі па аблізанцы, а малыя па шкодзе. Пад канец – рыбкай закусяць. І верхавой. І доннай. І ўсялякай, якая ёсьць... Да наступнай нагоды разыйдуцца. Жывуць, як і належыць суседзям. Адныя пра другіх дбаюць, а другія дбайцамі апякуюцца... Крыўды ніхто не трымае, але прынагодна, гэта значыць – як наш падонкаўскі човен зь іхным вярхоўскім на вадзе сустрэнуцца, так яно зноў і выбухне:

– Апусьці ніжэй патапец, боўтка! – крычыць вярховец падонкаўцу.

– Сам ты боўтка, – абзываецца падонкавец, ды наўмысна патапец да вудзільна цягне...

Далей вы ўжо і так ведаеце... Ды й я не пра тое.

Жыла вёска. Нараджала дзяцей, у сьвет выпраўляла, чакала дадому і аднойчы дачакалася...

Пятрок Мянтуз быў некалі, як і ўсе дзеці: дурэў, сваволіў, кароў пасьвіў, у школе – пасярэдзіне пасьпяваў. Карацей –звычайны падонкавец. Ў войска йшоў: суткі вёска гудзела. Нават вярхоўцы забеглі чарку ўзяць. А калі гэта ня так было? Заўсёды так. Чым жа Пятрок адрозны? Ну, не вярнуўся з войска. З кім не бывае. Асталяваўся ў мястэчку – яшчэ лепей. На пасаду ўзьбіўся – падонкаўцам гонар... Мішка Самёнак вунь дырэктарам фабрыкі робіць. Хто камень кіне? Ніхто. Ён нас не чапае, мы – яго. Але прынагодна не забудземся, куды Мішка выбіўся. А ўжо вярхоўцу ў сварцы абавязкова тыцнем. Важны панфіль. Хаця і ў тых у калодзе вышнікі – не навіна...

Навіна. Дачуліся: Пятрок у вёску вяртаецца. Важнецкую пасаду яму ў нас прызначылі: ці – порк, ці – торк, ці – тое й другое разам, прынамсі неяк так гэта гучэла па-нашаму, па-падонкаўску. А як па-праўдзе – няхай там начальства разьбіраецца. Нам што? Нам працоўныя кніжкі не выпісваць і на службовых паперах подпісы не выкручваць.

Рана-ранюсенька, у суботу, а можа і ў пятніцу, памятаю жонка яшчэ бліны пякла, дык хутчэй – у нядзелю, за вакном: брум-брум-брум, гамульцы візгнулі, дзьверкі бразнулі, клямка ў брамцы зьвягнула: Пятрок прыехаў... Матка ягоная, што тыдзень да сыночка ў мястэчка езьдзіла, а тут, як век ня бачыла: басанож, без хусьцінкі на падворак выскачыла. Пацалавала. Сьледам бацька выцягся. Гэты, што праўда, у мястэчка ні нагой – ад золку з вудамі...

Ну, клікнулі яны суседзяў. Селі за стол. Па чарцы гэпнулі, гурочкамі хрумнулі, а далей ужо пад рыбачку. На пачатку, ведама ж, – донную. Гэта па завядзёнцы так. А як госьці ўп'юцца, тады й розьніца невялікая: хоць верхаводную, хоць ніякую, а хоць і жабу засмаж – закусіцца ды забудзецца.

Пятрок таксама сваім трымаецца: чарка ў чарку зь іншымі глыкае, лыжка ў лыжку сёрбае, слова ў слова гамонку трымае... Так першы стол адседзелі. Каму куды трэба – зьбегалі, сьвежага паветра хапнулі, акурат на другі стол пасьпелі, донкі-падонкі скончылі... За трэцім сталом, за жабіным, адныя – лыка ня вяжуць, другія ці ёсьць – ня ведаюць, трэція –чацьвертага стала спадзяюцца – трымаюцца. Пятрок наш з гэтымі, з апошнімі. Да іх і кажа:

– А што эта ў нас, мужычкі, у дзірэвні за названіе? Куды ні прыдзёш – удзіўляюцца. Ніхарошае эта слова: Падонкі.

Кажуць, хацеў стары Базыль пры тых словах прамоўцу ў лыч храснуць, і храснуў бы мусі быць, каб ад пачатку жабін стол на апошні ня вызначыў. Ды й Базыліха за шарачок тузнула, маўляў, сядзі, адбіўся сваё, адпражыўся, маладзейшыя ёсьць і тыя маўчаць, чаго табе сунуцца?

А Пятрок не сунімаецца:

– Пасматрыце, – кажа, – какіе места тут у вас красівыя: ну, лес там, озера, пціцы пают, сірэнь, як гаварыцца, цьвіцёт і пахнет... А тут вы – такіе цёмные, што ніўдобна дзелаецца... Нябось і ціпер озера Падонкаўскім называеце? Вот, вот... А Верхавенскае – красівей названіе...

– Што праўда, то праўда, – узьняўся з-за стала ціхмяны раней Колька Човен. – І мясьціны ў нас тут, як ты сказаў, – красівыя, і сярэнь цьвіцёт. І дзяды нашыя, дзякуй Богу, пражылі тут свае стагодзьдзі. Добра жылі? Кепска? Хто знае? Ды, як бы ні жылі – імёнаў ня рушылі.

– Ня мы прыдумалі, ня нам і мяняць, – у тон дадаў нехта зь цёмнага кута стала.

– Так ня вы ш і меняць будзеце, – усердзіўся Пятрок, – сабіром праўленіе, абсудзім, пісьмо куда следавает напішам.

– Пакінь, сынку, абы што плявузгаць, – не стрымаўся ўрэшце Петракоў бацька... – Колькі я скулаў па маладосьці за гэтыя назвы верхавенцам пазварочваў. Потым мірыліся, але свайго трымаліся.

Прыацiх Пятрок. Задумаўся. Гулянка на шчыліну атрымалася. Астатнія таксама сьцішыліся... У вокны ночка патачылася. Хаця й зорная, а ўсё ж – ночка...

За старасьцю не прыпомню: год прайшоў? Два? Болей? Не адна павучынка ў куце выткалася, ня раз птушка птушанят у сьвет пусьціла. А й малыя шчупачкі за гэты час на дарослых высьпелі.

Пятрок таксама часу не марнаваў: хату паставіў – яшчэ адзін гонар на ўсю ваколіцу. Вёску зь сярэдняй у лепшыя выцягнуў – ізноў гонар. Бабы нашыя не па хатах і не ў мястэчку – у вёсцы абновы замаўляюць: хочаш – пашыюць, хочаш – гатовыя прывязуць. Верхавенцы на нас з зайздрасьцяй, а мы – тыя ж: носу вышэй галавы не дзяром. Гонар, ён усярэдзіне добры, а звонку – сьмех ды й толькі. За Петраковай, глядзіш, і іншыя хаты ў неба пацягнуліся, асфальт крывыя вулкі на простыя выкаціў, аўтобус па сто разоў на дзень у мястэчка загойсаў, ды яшчэ й праз Вярхоўцы...



Паехаў і я раз на ім. Выгодна. Прыемна. У вакно ветрык залятае – ня ўпрэеш. Навокал палі са статкамі, збажына узыходзіць... Патоўкся на мястэчковым кірмашы. Хацеў, як колісь, зь верхавенцамі брахнуцца – змоўчалі. Глянуў на іхнюю рыбу –донная!.. Праўду скажу: паскудна мне стала з гэтага. «Хведзька! – кажу свайму старому мардабойскаму непрыяцелю й добраму сябруку, – як жа вы гэта?!» «Так, як і вы...» – адказвае і вочы ўбок адлыпвае. Кінуўся я тады да іншых – тое ж... Плюнуў са злосьці. Сеў у аўтобус. Дадому еду. А думкі так і джгаюць: «Няўжо за сукенку ды за стрэхі бляхай крытыя? Ну ж, верхавенцы! Ну ж, псякрэў, як зламіліся! Ці ж тое, яно – усё вартае? Моташна! Вочы б мае ня бачылі! Навошта ў мястэчка папёрся? Здох бы ў сваёй хаце ня ведаўшы!.. Высадзі мяне тут, сынку, – прашу кіроўцу, а той мне:

– Січас прыедзем.

Не стрымаўся я: кіем на яго замахнуўся. Высадзіў. Сеў я ля дарогі. Аддыхаўся. Двое на роварах праехалі, «алкашом» узнагародзілі. Хацеў гыркнуць, ды падумаў: сьмяяцца будуць...

Дадому ня йшлося... Як некалі ў маладосьці часінай смутку цягнула на самоту, на возера... Там, са стромага берага, над вузкім пяшчаным наўзьбярэжжам адкрываўся цудны краявід на Вярхоўцы ў густой зяленіне дрэваў і на мае Падонкі ў бэзавых россыпах... Унізе падлеткі вудзілі. Я пазіраў на іх і супакой агортваў маю душу, утаймоўваў думкі...

– Апусьці ніжэй патапец, боўтка! – пачулася раптам ад вады.

– Сам ты боўтка! – грымнула ў адказ і смутак у момант пакінуў маю йстоту.

– Не апускай патапцу, унучак, – крыкнуў я з усяе сілы.

– Не апушчу, дзеду! – адгукнулася зьнізу.

Яно прагучала мне, як голас зь нябёсаў, як даўно забытае прызнаньне ў каханьні, клятва ў вернасьці...

Дзеці выбраліся на строму.

А вы, дзядуля, адкуль, – запытаўся ў мяне малы верхавенец, –зь Серанёўкі?

– Зь Сярэнеўкі! – відочна варожа выправіў яго падонкавец.

– З Падонкаў, адказаў я і адчуў, як мой голас нечакана дрыгнуў.

– Адкуль? – траха ня разам не зразумелі малыя.

– Ну, адкуль, – ужо конча разгубіўся я, – з гэтай... зь як яе... Сярэнеўкі...

20 чэрвеня 1995 г. Прага

Адам Глёбус

Афарызмы

◆ Злы гаворыць трапна.

◆ Паміж сьмеласьцю й безразважнасьцю няма мяжы.

◆ Праўды не саромеецца вар'ят.

◆ Войска выбудоўваецца, каб разбураць.

◆ Колькасьць крыві ў чалавека абмежаваная, а прага быць свабодым не.

◆ Свабоды баіцца раб.

◆ Добрых уладароў не існуе.

◆ Агульнапрынятыя нормы і пераканаўні зьмяняюцца значна хутчэй, чым асабістыя.

◆ Калі табе перасталі зайздросьціць, значыць, згубіў талент.

◆ Злодзей перш-наперш абкрадае сябе.

◆ Пісаць — азначае перакладаць уласныя ўражаньні на агульнавядомую мову, а чытаць — азначае вяртаць з агульнага ў асабістае.

◆ Уражаньне ад уласнага голасу не супадае з пачутым іншымі, так і меркаваньні пра цябе не супадаюць з самаацэнкамі.

◆ Аскетызм паходзіць не ад скваппасьці, а ад шчодрасьці.

◆ Тэрарыст уваходзіць у вечнасьць праз асьляпляльную яркасьць аднаго імгненьня.

◆ У чалавека толькі тры сапраўдныя ворагі: вар'яцтва, бяссоньне і голад.

◆ Экстрэмізм — шлях лайдакоў.

◆ Златнасьць мастака да пераўвасабленьняў і вызначае працягласьць творчага жыцьця.

◆ Караля робіць сьвіта, або суседняя дзяржава.

◆ Адзіны, каму варта даравацъ сьмяротныя грахі — ты сам.

◆ Ведаеш: усё папулярнае кепскае; але ведаць недастаткова, каб умець тое рабіць, а тым больш выкарыстоўваць.

◆ Гэта падман, што можна карыстацца чужымі поглядамі.

◆ Калі ты дамовісься з сабою, ёсьць надзея, што паразумеесься зь іншымі.

◆ Сьмелы ваяр — гэта перадусім пакорлівы раб.

◆ Радасьць — усьмешка, а ня рогат.

◆ Той, хто верыць у тэхнічны прагрэс, павінен памятаць, што пры дапамозе сродкаў вытворчасьці, самых розных машын і мэханізмаў адзін чалавек зрабіў з другога раба.

◆ Чалавек адрозьніваецца ад жывёлы тым, што добра ведае, як зручна нападаць удваіх на аднаго.

◆ Паміж поўным ідыётам і вельмі разумным чалавекам менш розьніцы, чымся паміж мёртвым і жывым.

◆ Вядомасьць дасягаецца толькі праз кепскую рэпутацыю.

◆ Бунт — рэалізаваная мара рабоў.


◆ Падтрымка прыходзіць да таго, хто яе заслужыў; на такіх сафізмах і будуюцца ўлада, прыгнёт і рабства.

◆ Вышыня сёньняшняга трыюмфу сьведчыць пра глыбіню заўтрашняга падзеньня.

◆ Афарызм — ангельскі жарт, вымаўлены з францускім акцэнтам і нямецкай стараннасьцю.

◆ Чалавек малюе адно сябе, таму тыгры атрымліваюцца маленькія, а мурашы — вялікія.

◆ Мазахістаў болей, чым садыстаў, доказ гэтаму — вынікі дэмакратычных выбараў: дыктатараў абіраюць сьвядома.



Сяргей Пульша

Твой горад

Іншым разам за ўсімі справамі, мітусьнёю і працаю бывае цяжка спасьцігнуць, што значыць для цябе слова «радзіма». І калі ты ўжо канчаткова адчуваеш, што сэнс гэтага слова губляецца, трэба... проста вярнуцца да яе.

Калі праваднік вагону, зь якім ты правёў апошнія пяць гадзінаў, вясёла камандуе табе: «Скідзель», і ты саскокваеш на плятформу вакзала, на цябе проста абрушваецца сьвежасьць. Цябе агортвае пах ночы, гоман вакзалу і нешта такое, чаго табе не чуваць, але хутка ты зразумееш — гэта начныя ліхтары раскідваюць сваё сьвятло навокал. Лёгкі ветрык варушыць твае валасы, ты крочыш па пэроне і адразу адчуваеш — гэта Твой Горад. Ён сустракае цябе смуродам цягнікоў і прыемным пахам печкі, якую паляць праваднікі.

Ты вясёла ідзеш да аўтобусна-тралейбуснага прыпынку і гэтаксама вясёла мінаеш яго. Бо ты ня бачыў свайго гораду амаль сто гадоў. І цяпер ты маеш поўнае права прайсьці па цэнтральнай вуліцы крокам пераможцы. Ты не сьпяшаесься і нікога не баісься, бо тут усё, абсалютна ўсё належыць табе. Вось крама, у якой у дзяцінстве табе набывалі цацкі. А вось лепшая ў горадзе бібліятэка, дзе ты перачытаў усё, што пасьпеў. А вось і гарсавет, дзе ты не адзін раз адсылаўся з пакою ў пакой. Сёньня гэта — тваё, разам з тваім паветрам і сьвятлом тваіх ліхтароў.

Чуваць, як ззаду йдзе нейкі аўтобус. Калі гэта ня твой нумар — ён пойдзе сваім шляхам. А калі твой — ён пачакае цябе. Бо ён таксама належыць табе, трэба толькі быць у гэтым абсалютна ўпэўненым. Не, гэта дакладна ня твой нумар, бо ён занадта павольна едзе. І калі аўтобус мінае цябе, ты бачыш — гэта нумар ня твой...

А вось яшчэ адна крама. Пакуль цябе тут не было, у ёй завялі нейкі супэрмаркет. На фасадзе надпіс: «Новы кошт!» Не хвалюе, што гэта той кошт, які ў сталіцы трымаецца з паўгода. І неяк прыемна, што ў гэтай вар'яцкай краіне хоць нешта стала таньней, хай гэта і «Coca-Cola», смак якой табе не падабаецца «зь першай лыжкі».

Няма навязьлівай рэклямы, няма паўсюдных у сталіцы міліцэйскіх «бобікаў» ды камуфляжаў. А вось і старая будоўля, якая стаяла тут сто гадоў таму і стаіць сёньня, перагароджваючы вуліцу, нікуды не зьнікае. А насустрач табе валяць студэнты, якія пачыналі вучыцца ў інстытуце, а заканчваюць ужо ва ўнівэрсытэце. Але, нягледзячы на гэта, як былі яны вясёлымі хлопцамі і дзяўчатамі, так і засталіся — маладыя і прыгожыя. Асабліва дзяўчаты...

Шукаеш сярод іх знаёмыя твары.

Вось ізноўку йдзе аўтобус. Пад'яжджае да прыпынку, спыняецца і... чакае. Чакае, бо гэта твой нумар. Ты спакойна і ветліва скокаеш на падножку. І адразу ж адчуваеш, што жывеш у прамысловым «спальным раёне». Амаль няма цьвярозых твараў і перагарам ня дыхаюць хіба што жанчыны. Але нічога ня зробіш — вечар перад уік-эндам. За апошні час п'яных у горадзе моцна паболела.

Міліцыянты, як і «ў застой», ганяюць моладзь і стрыгуць ёй валасы ў пастарунках. Моладзь жаліцца ў прэсу. Пасьля аднаго з чарговых скандалаў міліцыя сьціхла, але потым, на Дзень Гораду аднаго зь нефармальна апранутых і доўгавалосых зьбілі да сьмерці. Цяпер міліцыя кажа: «Хлопец пабег ад патруля, спатыкнуўся, упаў і забіўся насьмерць». А грамадзкасьць дамагаецца расьсьледаваньня гэтай справы. Падобна на міні-вайну, але ахвяры тут сапраўдныя. І гэта таксама — Твой Горад.

Дом сустракае цябе пахам яблыкаў. Тут сёньня цябе не чакалі...

Гэта — Твой Горад. Твая Радзіма. Радзіма, якую ты не аддасі нікому — ні д'яблу, ні прэзыдэнту. І, калі спатрэбіцца, змагацца ты будзеш — менавіта за яе — з кім заўгодна. І нікуды ты адсюль дабраахвотна ня зьедзеш, як бы кепска тут ні было. Бо гэта — твая Радзіма. Твой Горад.

І ты здольны сам, сваімі рукамі і галавою, зрабіць яго лепш.

Ганна Матусэвіч

Дзёньнік без канца

1.10. Усё павінна ўмясьціць у сабе матчына сэрца. І ва ўсім ведаць меру. І можа лепш ужо недадаць, чым перадаць. Старыя людзі кажуць, што беднасьць чалавек перанясе, а раскошы — не. А калі чаго недадасі — то прыбягуць па дабаўку, як сёньня Міколка.

Перабраў самастойна слоік журавінаў, страшна задаволенаму маленькаму чалавечку я дала ва ўзнагароду тыя ж журавіны з цукрам. Ён зьеў, пакінуўшы рэшткі цукру на дне. Я забрала ад яго гэты шкодны ласунак. Чалавечак адасобіўся ад мяне ў суседні пакой, спрабаваў заняцца сім-тым, пасьля прыйшоў і са сьлязьмі на вочках выклаў мне сваю крыўду: «Я табе перабраў журавіны, а ты мне цукру ня дала!» Я мусіла яго прылашчыць і даць цукерку.

3.10. «Но прекрасно и мудро поступаете Вы, что не оставляете без внимания ни одного рассказа и наговора, но проверяете их и разбиваете их. Это самая лучшая политика. Бояться нам нечего, ибо ничего противозаконного в нашей деятельности нет, наоборот, она поддерживает все лучшие устои, все то, на чем держится жизнь» (Зь ліста Алены Рэрых).

Мне здаецца, што мае рацыю Аляксандар Дабравольскі, калі кажа, што незалежным газэтам трэба абскардзіць у судзе кручкатворніцкія «предупреждения», ды не чакаць, калі зьбярэцца іх напоўніцу, каб мядзьведзю зараз заціснуць дэмакратычныя выданьні на праснак.

Адчуваю гэтае злавеснае зацішша перад навальніцай. Маўчаць, як вады ў рот набраўшы, мае сябры-менчукі, як мышы пад венікам затаіліся тутэйшыя бээнэфаўцы.

Дзеюць цяпер простыя людзі, якія сэрцам адчуваюць небясьпеку, што павісла над блізкімі людзьмі. Сэрца, яно ня ведае межаў. Мая цётка і з Аўстраліі пачула...

Што прынясе нам навальніца?

6.10. У нашым маленькім мястэчку, на скрыжаваньні 3-х вялікіх вуліцаў зь нянашымі назовамі К.Маркса, 1-ай ды 2-ой Ленінскіх ляжыць змрок. І на чорным небе ледзь-ледзь можна ўгледзець зоркі-прывіды. Але ў сёньняшні глухі й зацішлівы вечар я зрабіла тое, чаго звычайна пазьбягала рабіць нават у дачыненьні да блізкіх людзей. Выпадковаму чалавеку, які ўлукаткі брыў у цямрэчы ды салёнымі мацюкамі плёў пра сябе, што ён да 30 гадоў сядзеў у турме, — пацiснула руку.

7.10. Па асфальтаванай дарозе мы йшлі сёньня зь Веранікай у 4-ую клясу. Асфальт ужо ляжаў тут, калі Вераніка хадзіла ў трэцюю клясу. А ў першую клясу я адной рукой вяла Вераніку, другой цягнула каляску зь Міколкам. Не аднойчы слабенькія колцы каляскі ўсмокваліся пражэрлівай дрыгвою. А перад самай школьнай брамай, як роў перад сярэднявечным замкам, стаяла вялізнае возера-лужына. Сьмешныя людзі кідалі туды трэскі й паўзьлі па іх, што тыя жукі, да выратавальнай брамы. За брамай, на школьным двары, ляжаў асфальтавы абсяг. Я чула аднойчы, як чысьценькі ахайны папачка, што скакаў пад ручку са сваёй маленькай дачушкай-першаклясьніцай па трэсках у лужыне, ілжэпарочыў дзіцяці, уздымаючыся на нейкую долю хвіліны ад зямнога бруду: «Вот когда ты, доченька, пойдешь в 11-ый класс, здесь покладут асфальт».


Неяк пасьля ўжо звыклай небясьпечнай вандроўкі да школы я пакінула соннага Міколку ў калясцы на цьвёрдай зямлі, а сама пабегла ў будынак дагледзець Вераніку. Хтосьці з падшывальцаў сунуў недакурак у рот дзіцяці. Мяне затрэсла. Я ўзлавалася не на жартачкі. Усю сваю злосную энэргію выліла ў лісьце-звароце да тутэйшых уладаў, каб тыя ўпарадкавалі нарэшце дарогу да храма навукі. (Лішне казаць, што пісала не на скалечанай мове.) Прапанавала настаўнікам падпісацца пад зваротам. Баязьліўцы шчаміліся ў самы цёмны куток і адтуль паглядалі на мяне, як на вар'ятку.

Але зьлягчаны ад злосьці й чысты ад подпісаў зварот усё ж зачыталі па раённым брахунку. Ва ўсялякім разе так мне пераказалі, бо я сама ня маю звычкі слухаць брахункоў. Нажыла сабе адукаваных ворагаў, што ў людзкай чарзе па-хамску станавіліся да майго адкрытага пераду сваім глухім задам. Цяпер мне ўсё мінулае ўспамінаецца нейкім недарэчным сном. Але я радая, што ня споўнілася ілжэпароцтва ахайнага папачкі-скакуна, і мы зь Веранікай ішлі сёньня па добрай асфальтаванай дарозе.

Дык што, Дзецюкі, няўжо ж мы разам ня здужаем нейкага задрыпу-узурпатара і ягоных паддрыпаў, калі я, жанчына, адна праклала дарогу да школы?!

8.10. Сёньня мы атрымалі нарэшце доўгачаканае запрашэньне ў Латвію ды фатаздымкі, зробленыя нашымі сваякамі падчас іхняга наведваньня да нас улетку. Наперадзе яшчэ шмат руцiннай працы, афармленьне візы, але ж зьявіліся расколіны ў амаль чатырохгадовае даўнасьці лёдзе. (Столькі часу мы ня мелі магчымасьці патрапіць на гэтую нечужую нам зямлю.) І я ў парыве радасьці высылаю фатаздымак мяне й Віталіка для «НН». Няхай гэткі прэзэнт будзе добрай весткай напярэдадні беларускага Армагедону.


Койданава



Зацемкі тутэйшага этнографа

МІТ

Уладзімер Лобач



Я застаўся незаўважаным выпадкова. Магчыма, дапамог мой вайсковы «камуфляж», у якім я выпраўляюся ў экспэдыцыю, магчыма, я папросту быў схаваны дрэвамі.

На невялікай прагаліне перад «Сьцёп-камянём» нібы з-пад зямлі зьявілася бабуля з унучкай. Па ўсім было відаць, што выправіліся яны ў чарніцы, і я ўжо хацеў павітацца (між намі было ня болей за 10 мэтраў), але бабуля, запаволіўшы хаду, узяла ўнучку за руку і падвяла да камяня.

Вялікая каменная стэла была вышэй за іх ці ня ў два разы. Маўклівая і велічная ў сваёй непарушнасьці, яна гіпнатызавала мае ўяўленьні ўжо некалькі дзён. Бо тут, сярод ляснога гушчару, гэты вялізны каменны зуб выпнуўся зь зямлі рэальным сьведчаньнем пра існаваньне нейкае невядомае дагэтуль істоты, эпохі, культуры... Я сьцішыўся, бо адчуў, што зараз адбудзецца нешта інтымнае, не прызначнае для чужых вачэй.

Бабуля агледзелася і, нахіліўшыся да малой, пачала нешта прыцішана, але хутка распавядаць. Я амаль ня чуў словаў, але выразна адчуў інтанацыю:

— ... І тады пракляла яна яго: «Каб ты камянём стаў». І як толькі яна гэта сказала...

Я ня мог чуць усіх словаў, але я ведаў, ШТО распавядае бабуля сваёй унучцы. Гэта была праўда Сьцёп-камяня — скамянелага чалавека. Гэта быў міт.

Калі бабуля завяршыла аповед, мне падалося, што рэакцыя ўнучкі не такая ўжо й важная для яе. Галоўным было прамовіць, агучыць гэта тут, сярод лесу, перад камянём. Агучыць, і праз тое зноў (дзясяты ці соты раз?) зрабіць ПРАЎДЗІВЫМ. Калі прагучала апошняе слова, бабуля выпрасталася, выцерла канцом хусткі вусны. Яшчэ з імгненьне яна стаяла з адсутным выразам твару, нібы на ўласную памяць прабягалася па агучаным, а потым раптоўна зьмянілася, засьмяялася пра нешта ПУСТОЕ. Яшчэ праз імгненьне яны схаваліся ў гушчары. Як і не было.

Я сядзеў уражаны, бо памятаў гэтую бабулю з твару. Напярэдадні, калі мы хадзілі па вёсках і апытвалі людзей, яна сьмяялася на нашыя пытаньні пра Камень, адмахваючыся рукой нібы ад нечага несур'ёзнага. Тут жа, сам-насам зь ім, яна дастала, як дастаюць з куфра пахавальны строй, праўду.

Праўда заўсёды — таямніца. Праўда ніколі не ляжыць на паверхні, бо яна — фэномэн глыбока ўнутраны, інтымны. Сваю Праўду немагчыма давесьці нікому іншаму так, каб яна цалкам сталася ягонай праўдай. Праўда, якую нельга вэрыфікаваць, але можна агучыць, ажывіць — гэта МІТ. Міт, пазбаўлены інтымнасьці, што значыць, веры і праўдзівасьці, — гэта Вэрсія. Менавіта вэрсіямі частавалі нас па вёсках, як частавалі, я больш чым перакананы, і этнографаў XIX ст.

Некалькі вёсак, што аблеглі лес са Сьцёп-камянём, утварылі мікрапрастору сваёй мітавай Праўды. Яе нельга вынесьці за нябачныя межы, аддаліць болей чым дазволена (кім?) ад сакральнага цэнтру. Калі ж выходзіш за межы гэтае мітавае прасторы, адразу трапляеш у іншае кола, зь іншым сакральным цэнтрам (прошча, сьвятое дрэва ці іншае). Але і ў першым выпадку, і ў другім ты аднолькава чужы. «Хто ты, і што ты тут робіш?» Нават простае тваё зьяўленьне парушае альбо замінае суладзьдзю, якое складалася тут, у гэтай канкрэтнай мясцовасьці.

Калі мы пыталіся ў мясцовых, як адшукаць Сьцёп-камень і дайсьці да яго, ні адзін з адказаў не супаў зь іншым —блытаніна поўная. Тым болей, ніхто не захацеў нас правесьці да яго, хоць справы было на 20 хвілінаў. Яны не жадалі, каб мы да яго дайшлі. Бо на сустрэчнае пытаньне «Нашто ён вам?» яны чулі ў адказ суцэльны, зь іх гледзішча, абсурд: археалягічныя раскопкі, навуковыя дасьледаваньні...

Мы прыйшлі, каб вэрыфікаваць іх праўду. Цётка, якая прадала нам малака, увесь час распытвала, чым мы займаемся ля Камяня, а потым на разьвітаньне, сумеўшыся, кранальна папрасіла: «Вы ж зь ІМ нічога не зрабіце».

На векавой сасьне Акуліне — глыбокі надпіл. Мужыкі зь леспрамгасу чысьцілі лес ад старых дрэваў. Чаму не дапілавалі? Пырснула кроў!

«А на той гары жыла Дарота. Дзеўка-воін. Дык на Купальле яна перакідвалася дубінамі з княжной-чараўніцай, што жыла на востраве...»

«У Сьвятым возеры купацца ня можна было і сьціраць таксама. А вада ў ім лячэбная. Там даўней царква стаяла і аднаго разу...»

Крок за крокам ты набліжаесься да вёскі. Ты зь ёй знаёмы завочна. Ты «ўзброены» нататнікам, фотаапаратам і дыктафонам. Ты ўсхваляваны, бо ты ў прадчуваньні нечага, і не заўважаеш, як твае нястомныя ногі ахінае халодны жнівеньскі туман, як на тваіх вайсковых ботах блішчыць дыямэнтамі ранішняя ліпеньская раса. Ты не заўважаеш, як з табой вітаецца МІТ, бо ты прагнеш яго зафіксаваць.

Не хвалюйся, зафіксуеш.

Але ці здолееш яго агучыць?

Расея — зблізку

Аўтамабіль — расейскае вар'яцтва

Працяг са старонкі 1.

Адна з прычынаў у тым, як адзначае «Форбс», што расейскія заводы выпускаюць самыя дрэнныя ў сьвеце машыны.

«Кожны аўтамабіль — гэта проста набор дэталяў, зь якіх вы павінны яго самі сабраць», — тлумачыць Аляксей Солапаў, аўтар аднаго з артыкулаў у расейскім аўтамабільным часопісе. Калі амэрыканскія журналісты запыталі ў маскоўскага таксоўшчыка, ці падабаецца яму «Волга», на якой ён езьдзіць, той адказаў: «Поўзае, як страя кляча». Часта выгадней набыць за 3500 даляраў дзесяцігадовы аўтамабіль «Вольва», чым «Ладу» 1996-га за 7 тысяч.

Расейскія аўтазаводы нагадваюць нешта зь Юрскага пэрыяду: яны велізарныя, інтэграваныя па вэртыкалі і вельмі блага кіруюцца. Ім звычайна патрабуецца ў 3-30 разоў больш чалавека-гадзінаў, каб выпусьціць пачварны аўтамабіль, чым амэрыканскаму ці японскаму прадпрыемству, каб зрабіць якасны. Выдаткі на аплату працы складаюць 200-350 даляраў у месяц на аднаго работніка —прыкладна 5 працэнтаў таго, што зарабляе работнік у Амэрыцы, але гэтая перавага зводзіцца да нуля неэфэктыўнасьцю.

«Джэнэрал мотарз» і «Форд» спрабуюць наладзіць тут зборку: першы хоча вырабляць 50 тысячаў «Блэйзэраў» штогодна ў Татарстане, другі — наладзіць зборку 6 тысячаў легкавых аўто, у тым ліку фургонаў, пад Менскам. (Аказваецца, будуючы пад Менскам, «Форд» будуе «ў Расеі», а ня ў нас. — Н.Н.) З улікам патэнцыйных магчымасьцяў рынку — гэта ўсяго толькі кропля, але нават гэтыя пляны чыста папярэднія. Да нядаўняга часу замежныя фірмы асьцерагаліся вярганьня да ўлады камуністаў. Але нават цяпер, пры мінімальнай палітычнай стабільнасьці, замежнікі пераконваюцца, як цяжка ствараць сумесныя прадпрыемствы. Чаму? Вось меркаваньне «Форбса»:

— Калі расейцы вядуць перамовы, яны жадаюць абавязкова перамагчы. Таму партнэру даводзіцца прайграваць, што наўрад ці можа лічыцца ўдалым падыходам да стварэньня сумесных прадпрыемстваў.

— Дырэктары іхніх прадпрыемстваў жадаюць атрымліваць грошы і тэхналёгію, але пры гэтым баяцца згубіць уладу.

— Яны разважаюць толькі гіганцкімі катэгорыямі. Аляксей Нікалаеў, дырэктар АўтаВАЗу, найвялікшага ў Расеі аўтазаводу, распавядае, што «Джэнэрал Мотарз» і паўднёвакарэйская «Дэу» прапанавалі наладзіць зборку на яго прадпрыемстве 50 тысячаў аўтамабіляў. «Гэта занадта мала», — кажа ён. АўтаВАЗ жадае пабудаваць зусім новае прадпрыемства, якое будзе выпускаць у год 300 тысячаў аўтамашын і на будаўніцтва якога патрэбна 2 мільярды даляраў.

Расейцы маюць рацыю, баючыся замежнай канкурэнцыі. Калі б не было імпартных пошлін, якія дасягаюць 100 працэнтаў, вытворцы аўтамабіляў у Расеі, безумоўна, сталі б банкрутамі.

Але нават пры такіх пошлінах у мінулым годзе ў краіну было ўвезена 450 тысячаў замежных машын. Гэта азначае, што замежнікі ўжо захапілі 40 прац. расейскага рынку. Але расейцы занадта ганарлівыя, каб з гэтым пагадзіцца. Якія ж пэрспэктывы ў найбуйнейшых кампаніяў?

ГАЗ, пабудаваны ў Горкім у 30-я гады з дапамогай Генры Форда, — тыповы прыклад гіганцкага заводу, які разьлічаны на выпуск 400 тысячаў грузавікоў. Навошта выпускаць маленькі грузавічок, калі можна пабудаваць вялікі? Груз, нават самы малы, у Расеі перавозіць цяжкавагавік. Але ГАЗ досыць хутка зрэагаваў на рыначныя фактары. Ён сканструяваў легкавы грузавік «Газэль» —якраз тое, што патрэбна малому бізнэсу. Летась было прададзена 60 тыс. такіх машынаў. Нягледзячы на тое, што ГАЗ працуе менеей чым на 60 працэнтаў сваёй вытворчай магутнасьці, у мінулым годзе было прададзена машын на 1,8 мільярда даляраў, і прыбытак склаў 314 мільёнаў.

«Расея цяпер імпартуе машыны, — кажа прэзыдэнт ГАЗа Мікалай Пугін, — таму мы павінны быць канкурэнтаздольнымі». Аўтамабіль, які выпускае ягоны завод, — гэта «Волга», вельмі падобная на тую, вытворчасьць якой пачалося ў 70-м. Кампанія зьбіраецца наладзіць выпуск сучаснай машыны зь пярэднім прывадам, з такой канструкцыяй кузава, каб яна рабіла ўражаньне прасторнага інтэр'еру, як у «Крайслера», і мела рухавік больш моцны, чым цяперашняя «Волга». Бяда ў тым, што ў ГАЗа няма ні грошай, ні тэхналёгіі. «Я хацеў бы разгледзець гэты праект разам за якой-небудзь заходняй фірмай, — кажа Пугін. — Нам патрэбны мільярд даляраў». Ня варта зьдзіўляцца, што грошай у завода няма. На ім працуюць 96 тыс. чалавек, якія выпускаюць 215 тыс. машын. На заводах «Крайслера» працуе 125 тыс. чалавек, і яны выпускаюць 1,8 мільёна аўтамабіляў.

У канцы 60-х Брэжнеў вырашыў стварыць савецкую аўтамабільную прамысловасьць. Яго вітрынай стаў пабудаваны ў Тальяці з дапамогай «Фіяту» АўтаВАЗ. Уражваюць яго памеры: зборачны канвэер цягнецца на мілю з чвэрцю. Ніякіх гатовых модуляў пры зборцы не выкарыстоўваецца. Кожная дэталь сама па сабе. Бесьперапынны грукат. Уганяюцца пракладкі, падганяюцца дзьверкі, бампэры, і ўсё гэта з дапамогай малатка. На канвэеры зборкі рухавікоў поршні ўкручваюць рукамі, а затым даводзяць малатком.

Але аддамо належнае расейцам. Іх аўтамабілі, магчыма, і саступаюць «Таёце», але ўсё ж гэта — аўтамабілі. У галоўным цэху тры зборачных канвэеры, і з кожнага штохвіліны сыходзіць аўтамабіль. Летась было выпушчана 620 тыс. машын.

У аўтазавода ёсьць сур'ёзныя праблемы, напрыклад, дылеры, якія зарабляюць грошы, у той час, калі кампанія нясе страты. Дылеры павінны ВАЗу 1,2 мільярды даляраў, што складае прыкладна 35 працэнтаў усяго збыту. Ці ёсьць шанцы забраць гэтыя грошы? Многія дылеры зьвязаныя з мафіяй, паспрабуйце атрымаць зь іх пазыку.

У пачатку 60-х Набярэжныя Чаўны былі мястэчкам з драўлянымі хатамі. Затым савецкія стратэгі пабудавалі на Каме грэблю і вырашылі, што гэта цудаўнае месца для будаўніцтва самага вялікага ў сьвеце завода грузавікоў. КАМАЗ — гэта 50 кв. км, яго зборачны канвээр тэарэтычна здольны выпускаць 150 тысячаў вялікіх грузавікоў. Увесь амэрыканскі рынак важкіх грузавікоў складае 150 тысячаў у звычайны год і 200 тысячаў у пэрыяды ўздыму. У 1988 годзе КАМАЗ прадаў 130 тысячаў грузавікоў. Потым адбыўся крах камунізму, а разам зь ім рухнуў рынак важкіх грузавікоў. Летась вытворчасьць на КАМАЗе скарацілася да 23 тысячаў машын.

Прэзыдэнт КАМАЗу Мікалай Бех ведае, што трэба сьпяшацца. Ён ужо стварыў сумеснае прадпрыемства з «Камінз энджын» для вытворчасьці дызэльных рухавікоў гэтай амэрыканскай фірмы і настолькі скараціў выдаткі, што КАМАЗ змог атрымліваць прыбыткі, выпускаючы ўсяго 23-35 тысячаў грузавікоў. Але Беху патрэбна нешта большае. «Мы хочам мець партнэра, які мог бы прадстаўляць нас на сусьветным рынку капіталу», — кажа ён. У 1994 годзе Бех заключыў пагадненьне зь фірмай «Колбэрг Кравіс Робэртс», якая згадзілася мабілізаваць за 6 гадоў 3,5 мільярды даляраў у абмен на 49 працэнтаў акцыяў КАМАЗу. Гэты сродкі павінны пайсьці на новы 25-тонны грузавік для нафтавай і лясной прамысловасьці, а таксама на гусянічны цягач, які здольны канкураваць зь лепшымі замежнымі мадэлямі, і на легкавы грузавік накшталт «Газэлі».

КАМАЗ хоча заняцца і выпускам малалітражнага аўтамабіля «Ака». Але пакуль праект КАМАЗу-«Камінз энджын» ня зрушыў зь месца: бракуе грошай.


УАЗ — апошняя з расейскіх аўтакампаніяў, якія ўсё яшчэ трымаюцца. Яна выпускае недарожныя аўтамабілі павышанай праходнасьці — моцныя, але нязручныя і невялікія аўтобусы. Увогуле каля 93.000 машын за 1995 год. Зваротнага капіталу не хапае. Ні УАЗ, ні іншая кампанія не змаглі б выжыць на рынку свабоднай канкурэнцыі.

Урад Расеі хоча, каб выпуск «Масквічоў» і ЗІЛаў працягваўся. Заводы, якія іх вырабляюць, знаходзяцца ў Маскве, і было б ня надта добра, каб некалькі соцень тысячаў чалавек засталіся бяз працы. Армія зьбіраецца разьмясьціць замову на 6000 грузавікоў на ЗІЛе, рыхтуецца пагадненьне з «Рэно» пра рухавікі для «Масквічоў».

Патэнцыйныя магчымасьці ёсьць, рэзюмуюць амэрыканскія аўтары, але расейскаму аўтапраму вельмі патрэбны замежны капітал, веды і досьвед. Пройдзе час, пакуль Расея зможа выпускаць тыя 4 млн. аўтамабіляў, пра якія кажуць аптымісты. Замежныя кампаніі, якія прыходзяць на расейскі рынак, дасягнуць у бліжэйшы час выдатных вынікаў.

Падрыхтаваў І.Д.

Конкурс



1

Крывіцкая Мэкка

Закончыўся наш конкурс «Якой веры?», які быў прысьвечаны розным беларускім канфэсіям. Гэтым разам пераможцы ўжо ёсьць. Вынікі конкурсу і адказы мы зьмесьцім у наступным нумары.

А сёньня мы пачынаем новы конкурс...

Колькі б ні мінула пакаленьняў, Вільня заўсёды будзе для беларусаў не чужая. Дзе б ні была Вільня: ці ў Расеі, ці ў Польшчы, ці ў Літве, — беларускі «прыбой неямоўкнучы з палёў» будзе заўсёды імкнуцца да віленскіх брамаў.

Наш новы конкурс прысьвечаны толькі аднаму гораду — месту, дзе 10 лістапада 1906 году нарадзілася «Наша Ніва» і дзе яна была адроджаная ў 1991-м. На здымках, якія мы будзем зьмяшчаць, перад Вамі паўстануць вуліцы, дамы і бажніцы, сярод якіх сотні гадоў тварылася Беларуская Справа. Мы спадзяемся, што Вы ня толькі пазнаеце тое, што будзе на здымках, але і паспрабуеце распавесьці нам, з чым і з кім зьвязаны той ці іншы аб'ект. Найбольш цікавыя лісты будуць адзначаныя асобна.

Як і заўсёды, пераможцаў чакаюць прэзэнты, але на гэты раз — віленскія... Чакаем адказаў пасьля апошняй загадкі. Да спатканьня.

Сяргей Харэўскі

© НАША НІВА Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая Наклад 5100 Нумар падпісаны ў друк 19[55], 13/10/1996. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова №6647 Кошт свабодны.